РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 ЧЭРВЕНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 108 (30496)

# ФЭСТЫ, КВЭСТЫ, МУЗЫЧНЫЯ ВЕЧАРЫНЫ

**Чым адметны месяц гісторыка-культурнага турызму**



Першы летні месяц прысвечаны гісторыка-культурнаму турызму. Замкі, палацы, музеі, сядзібы рыхтуюць шэраг праектаў і праграм для наведвальнікаў. Дарэчы, па выніках мінулага года ў топ-3 па наведвальнасці ўвайшлі мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь». Тэма патрыятычнага выхавання, 80-годдзя Вялікай Перамогі захоўвае лідарскія пазіцыі і сёлета. У першым квартале таксама найбольш запатрабаванымі для наведвання былі музеі ваеннай тэматыкі.

СТАР. 8–9

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**



**+TV ПРАГРАМА**

У ЗОНЕ АСАБЛІВАЙ УВАГІ



ПАДКАЗКІ БУДУЧЫМ АБІТУРЫЕНТАМ

6–7




Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2025 года

**Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

ISSN 1990 — 763X

# «САЮЗНІЦКАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ, ЯКОЕ НЕ МОЖА ЗМЯНЯЦЦА ПАД УПЛЫВАМ ЛЮБЫХ УЗРУШЭННЯЎ АБО ВАГАННЯЎ МІЖНАРОДНАЙ АБСТАНОЎКІ»

## Эксперты — аб адносінах Беларусі і Кітая і аб значэнні ў іх развіцці нядаўняга візіту Прэзідэнта

Візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай, пра які сам кіраўнік дзяржавы па выніках сказаў: «Усё прайшло як мага лепш», і сёння застаецца ў цэнтры ўвагі экспертнай супольнасці. Асаблівы «сямейны» фармат сустрэчы лідараў Беларусі і Кітая, перагаворы з дзелавымі коламі — і як вынік дамоўленасці аб інтэнсіфікацыі супрацоўніцтва, асабліва ў сферы прамысловасці і высокіх тэхналогій, палітычны аспект візіту — усё гэта пацвярджэнне больш чым добрых раўнапраўных адносін нашай краіны з вялікім Кітаем у многіх сэнсах, якія выбудаваліся на працягу дзесяцігоддзяў дзякуючы дальнабачнай палітыцы кіраўніка беларускай дзяржавы.



Беларусь і Кітай знаходзяцца на высокім узроўні ўзаемнага даверу, адзначае **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Андрэй ЖАМОЙДА**.

«У Мінска і Пекіна шмат партнёраў, пры гэтым погляды лідараў дзвюх краін маюць агульны корань унутранай і міжнароднай палітыкі, — лічыць ён. — Мы не проста вядзём узаемны гандаль, мы рэалізоўваем сумесныя праекты: Беларусь актыўна падтрымала будаўніцтва ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях». Беларусь паспяхова супрацоўнічае з КНР у культурнай і адукацыйнай сферы».

Адно з асноўных пытанняў у двухбаковым супрацоўніцтве — машынабудаўнічая галіна і тэхналагічная мадэрнізацыя асобных кірункаў прамысловасці Беларусі. «Аляксандр Лукашэнка падзяліўся інфармацыяй аб тым, што гэта ідэя належыць Старшыні КНР Сі Цзіньпіну. Кітай — перадавая краіна з высокаразвітым прамысловым «інтэлектам». Я ўпэўнены: іх досвед у мадэрнізацыі прадпрыемстваў нам сапраўды спатрэбіцца», — кажа Андрэй Жамойда, які кіруе прадпрыемствам «Конус» Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі.

Адзначыў сенатар і важны паказальны аспект палітычнага плана — Беларусь не баіцца ізаляцыі. «У нас ёсць надзейныя партнёры, і гэта не толькі Расійская Федэрацыя, як прывыклі лічыць на Захадзе, нам ёсць, з кім сябраваць». На думку Андрэя Жамойды, сяброўская сямейная сустрэча кіраўнікоў Беларусі і Кітая «стане паказчыкам для сусветных лідараў, якія прагнуць «хлеба і відовішчаў» на славянскіх «падмостках», таго, як павінны будавацца адносіны ў XXI стагоддзі. Як можна дамаўляцца, не прымяняючы зброі. Як можна будаваць, не забіўшы ніводнага цвіка. Гэта сустрэча двух сяброў, двух партнёраў і двух лідараў, якія жадаюць сваім народам толькі міру і росквіту».





**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Алег ДЗЯЧЭНКА** лічыць пекінскую сустрэчу лідараў Беларусі і Кітая гістарычна значнай і ўнікальнай па форме і змесце яе правядзення. Кітайскі бок засведчыў глыбокую павагу да асобы Прэзідэнта Беларусі, а ў яго асобе — і да ўсяго беларускага народа.

Дэпутат адзначае, што да нефармальных перагавораў на вышэйшым узроўні, якія адбыліся ў рэзідэнцыі Чжунаньхай, яшчэ доўгі час будзе прыкавана ўвага палітычных аналітыкаў і прадстаўнікоў экспертнай супольнасці. «У атмасферы сапраўднага сяброўства, адкрыта і даверліва кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі ход рэалізацыі раней дасягнутых міждзяржаўных пагадненняў па самым шырокім спектры пытанняў геапалітычнага супрацоўніцтва. Вельмі цёплыя і напоўненыя філасофскім сэнсам адносіны нацыянальных лідараў каторы раз прадэманстравалі сусветнай супольнасці, што стратэгічнае партнёрства паміж нашымі краінамі развіваецца па нарастаючай, дынамічна, прагрэсіўна і сапраўды мае ўсепагодны характар».

Гаворачы аб змесце перагаворнага працэсу — аб далейшым развіцці навукова-тэхнічных і эканамічных адносін з Кітаем, аб мадэрнізацыі беларускіх прадпрыемстваў з выкарыстаннем высокіх кітайскіх тэхналогій, аб развіцці кааперацыі ў галінах, якія забяспечваюць нацыянальную бяспеку нашых дзяржаў, — Алег Дзячэнка падкрэсліў, што тавараабарот паміж нашымі краінамі з года ў год павялічваецца і склаў летась 8,6 мільярда долараў. «Дасягненні відавочныя. Але гэта не мяжа, — лічыць парламентарый. — Інтэнсіўна развіваецца ўзаемавыгаднае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва ў рамках геапалітычнага праекта «Адзін пояс, адзін шлях». Яскравы прыклад таму — функцыянаванне Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Новыя перспектывы для нас адкрыліся пасля ўваходжання ў ШАС і БРІКС».

Каб паспяхова канкурыраваць на сусветным рынку, беларускім прадпрыемствам неабходна забяспечыць выпуск высокатэхналагічнай прадукцыі. «І ў гэтым стратэгічна важным пытанні ў нас ёсць падтрымка і разуменне кітайскіх партнёраў, зацікаўленых у развіцці прамысловай кааперацыі і стварэнні сумесных вытворчасцяў, — адзначае Алег Дзячэнка. — Пры гэтым кожны з бакоў робіць свой вялікі ўнёсак у агульную справу. На выхадзе — тавары, якімі мы забяспечваем не толькі спажыўцоў Беларусі і Кітая, але і якія зможам выгадна рэалізаваць на рынках трэціх краін».

Дэпутат закрануў і яшчэ адзін важны кірунак беларуска-кітайскага супрацоўніцтва: «Мы сёння разам, плячо ў плячо, супрацьстаім розным эканамічным санкцыям і абмежаванням, якія пад надуманымі падставамі як інструмент нядобрасумленнай канкурэнцыі ўведзены Вашынгтонскай адміністрацыяй супраць беларускіх і кітайскіх прадпрыемстваў. Неабходна адзначыць, што сучасны Кітай паспяхова адбівае ўсе атакі чарговай тарыфнай вайны, абвешчанай амерыканскім прэзідэнтам-рэспубліканцам Дональдам Трампам, і лёгка нівеліруе ўсе прэтэнзіі амерыканцаў на сусветнае лідарства. У адрозненне ад заходніх глабалістаў Пекін падтрымлівае імкненне краін і народаў да ўмацавання справядлівага і шматпалярнага свету, у якім дастойнае месца займае і беларуская дзяржава».

Алег Дзячэнка таксама падкрэсліў, што, кіруючыся прынцыпамі ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства, нашы краіны дасягнулі беспрэцэдэнтнага ў гісторыі двухбаковых беларуска-кітайскіх адносін узроўню эканамічнага, палітычнага, навукова-тэхнічнага і ваенна-стратэгічнага ўзаемадзеяння, гатовы і ў далейшым сумесна з кітайскім народам адэкватна рэагаваць на ўсе пагрозы, што паступаюць.

Ва ўзаемаадносінах паміж Беларуссю і Кітаем адна з ключавых роляў адведзена навукова-тэхнічнаму супрацоўніцтву, звяртае ўвагу **Дзмітрый ЗАХАРЧУК, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні**. «Для абедзвюх краін інавацыйнае развіццё ў прыярытэце, —



адзначыў ён. — Заканамерна, што 2024—2025 гады аб'яўлены ўрадамі краін гадамі супрацоўніцтва Беларусі і КНР у галіне навукі, тэхналогій і інавацый, распрацаваны і падпісаны план сумесных мерапрыемстваў. Гэта надало дадатковы імпульс узаемадзеянню».

У парадак дня візіту Прэзідэнта Беларусі ў Кітай былі ўключаны пытанні машынабудаўнічай галіны і тэхналагічнай мадэрнізацыі асобных кірункаў прамысловасці Беларусі. «Вельмі важныя для нашай эканомікі тэмы, — лічыць Дзмітрый Захарчук. — Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў ролю Старшыні КНР у падключэнні Беларусі да працэсаў, якія ў Кітаі набралі вельмі высокія тэмпы. А чаго можна чакаць ад супрацоўніцтва з адным з вядучых сусветных вытворцаў цяжкай тэхнікі? Толькі добрых перспектыў».

— Кітай на сённяшні дзень па многіх параметрах — першая эканоміка свету, — акцэнтаваў увагу ў праграме «Будні» на «Альфа Радыё» **член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Аляксандр ШПАКОЎСКІ**. —



У нас адкрытая эканоміка індустрыяльнага тыпу. Гэта значыць, наша прамысловасць пастаянна мае патрэбу ў розных камплектуючых, крытычна значных таварах для далейшага развіцця. І для Беларусі Кітай выступае важнай крыніцай такога роду высокатэхналагічнай прадукцыі, асабліва ва ўмовах спроб тэхналагічнага эмбарга з боку дзяржаў Захаду. Калі мы гаворым аб неабходнасці пераходу да шостага тэхналагічнага ўкладу, тут, безумоўна, стаўка робіцца на Кітай. Гэта ў тым ліку ўкараненне рабатызацыі, тэхналогій штучнага інтэлекту. Тут, па сутнасці, Кітай выступае безальтэрнатыўнай крыніцай гэтых тэхналогій. Тым не менш і Беларусь, маючы сціплы ў параўнанні з Кітаем тэрытарыяльны і дэмаграфічны рэсурс, у частцы тэхналогій сёе-тое можа прапанаваць нашым кітайскім партнёрам. Значыць, нельга сказаць, што гэта вуліца з аднабаковым рухам.

Дэпутат падкрэсліў, што не ў многіх краінах назіраецца такі ўзровень адносін з Кітаем, як у Беларусі.

— У Кітая ёсць пэўная іерархія ўзаемадзеяння з замежнымі дзяржавамі. І трэба сказаць, што беларуска-кітайскія дыпламатычныя адносіны налічваюць 33 гады. У 1992 годзе мы падпісалі адпаведны дагавор, дзе была сціплая фармулёўка «сяброўства і супрацоўніцтва». З таго часу ўзровень палітычных адносін паміж Беларуссю і КНР павышаўся шэсць разоў. Сёння мы знаходзімся ў найвышэйшай фазе адносін у дыпламатычнай іерархіі Кітая. Гэта ўсепагоднае ўсебаковае стратэгічнае партнёрства. Эксперты-кітаязнаўцы трактуюць усепагоднае

партнёрства як саюзніцкае ўзаемадзеянне, якое не можа змяняцца пад уплывам любых узрушэнняў або ваганняў міжнароднай абстаноўкі. Гэта вельмі важна ў сучасным свеце, — дадаў госць праграмы.

Аляксандр Шпакоўскі нагадаў, што сам Старшыня КНР Сі Цзіньпін раней падкрэсліў: паміж Беларуссю і Кітаем мацнее традыцыйнае сяброўства.

— З аднаго боку — сярэднестатыстычная еўрапейская дзяржава, з другога — магутны Кітай, які прэтэндуе сёння фактычна на ролю накіравальнай сілы ў сучасным свеце, — акцэнтаваў увагу спікер. — Што нас звязвае? Што да эканамічнага складніка, у нас паступальна расце гандлёвы абарот. Важна адзначыць — расце і беларускі экспарт у Кітай. Інтарэс Кітая заўважны. Нас таксама звязвае светапоглядная блізкасць. Як сказаў Сі Цзіньпін, каб зразумець Кітай, трэба зразумець Камуністычную партыю Кітая. А беларуская дзяржаўная мадэль, якая захоўвае і сімвалічную, і сэнсавую, і эканамічную пераемнасць ад савецкай сацыялістычнай традыцыі, мне падаецца, для гэтага падыходзіць вельмі дарэчы. І, вядома, Беларусь — ключавы партнёр Кітая ў Цэнтральнаеўрапейскім рэгіёне ў кантэксце эканамічнага праекта «Пояс і шлях». Кітай дапамагае нам з вайсковымі тэхналогіямі. І, што вельмі важна для нас, КНР захоўвае пазітыўнае стаўленне да Беларусі ў частцы, якая датычыцца паставак крытычна значных камплектуючых для нашай прамысловасці, і ў частцы, якая датычыцца правядзення плацяжоў. Кітай для нас цяпер — адно са знешнепалітычных крылаў міжнароднай незалежнасці.

Гаворачы аб візіце беларускага Прэзідэнта ў Кітай у праграме «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» на канале Расія 1, Аляксандр Шпакоўскі адзначыў яго значэнне не толькі для Беларусі: «Характар прыёму нашага лідара ў Кітаі, уключаючы як афіцыйныя, так і нефармальныя перагаворы з Сі Цзіньпінам, сведчыць аб высокім узроўні даверу. У любой культуры запрашэнне дадому — гэта знак найвышэйшай павагі. Гэта сведчыць аб тым, што адносіны Беларусі з Кітаем развіваюцца не толькі ў лакальным двухбаковым фармаце з пункту гледжання нацыянальных інтарэсаў, але і ў глабальным кантэксце. Бо Аляксандр Лукашэнка не толькі Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, але і Старшыня Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Акрамя таго, сёлета Беларусь зноў старшынствуе ў Еўразійскім эканамічным саюзе».



**Аналітык БІСД Сяргей ВЯРГЕЙЧЫК** у каментарыі для канала CGTN Цэнтральнага тэлебачання Кітая адзначыў узаемавыгадны характар беларуска-кітайскага практычнага ўзаемадзеяння: «Пры садзейнічанні Кітая ў апошнія гады ў Беларусі асвоены новыя кампетэнцыі, напрыклад, у сферы біятэхналогій, легкавым аўтамабілебудаванні і інш. Аднак дынаміка ўнутранага развіцця патрабуе паскарэння ў засваенні перадавых тэхналогій для забеспячэння канкурэнтаздольнасці на сусветных рынках. У гэтым працэсе кааперацыя з Кітаем прынясе ўзаемную выгаду. Укараненне ў прамысловасць сучасных кітайскіх тэхналогій будзе садзейнічаць росту ўзаемнага тавараабароту ў інтарэсах паляпшэння дабрабыту насельніцтва».

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# НЕ СПЫНЯЦЦА НА ДАСЯГНУТЫМ

## Эканамічны рост назіраецца ва ўсіх краінах СНД



Фота БелТА.

**У Душанбэ ўчора прайшоў Савет кіраўнікоў урадаў СНД, удзел у якім прыняў Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр ТУРЧЫН. Бакі абмеркавалі актуальны парадак Садружнасці ў вузкім і пашыраным складах. Але перад гэтым адбылася сустрэча з лідарам Таджыкістана Эмамалі РАХМОНАМ. Падрабязнасці — у нашым матэрыяле.**

### ПРЫЯРЫТЭТЫ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр Турчын падчас абмену думкамі па актуальных пытаннях эканамічнага ўзаемадзеяння ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў у вузкім фармаце адзначыў той факт, што ва ўсіх краінах Садружнасці назіраецца эканамічны рост і другі год запар тэмпы росту ВУП у дзяржавах СНД перавышаюць сярэднесусветныя:

— Такая тэндэнцыя наглядна пацвярджае атрыманне канкрэтных выгод кожнай дзяржавай-удзельніцай ад эканамічнай інтэграцыі ў рамках Садружнасці.

На яго думку, нельга спыняцца на дасягнутым:

— Мы не можам ігнараваць турбулентнасць на сусветным рынку з прычыны розных абставін, уплыў разбуральных працэсаў на эканоміку дзяржаў — удзельніц Садружнасці і сусветную эканоміку ў цэлым.

У сувязі з гэтым у якасці прыярытэтных кірункаў эканамічнага ўзаемадзеяння ў рамках СНД Аляксандр Турчын вылучыў наступныя:

— Першы. Выкарыстанне механізмаў свабоднага гандлю таварамі і паслугамі, а таксама ўстараненне бар'ераў ва ўзаемным гандлі дазволіць нам выйсці на новы ўзровень гандлёва-эканамічных узаемаадносін у Садружнасці.

На яго думку, неабходна больш актыўна задзейнічаць патэнцыял дзеючай рабочай групы высокага ўзроўню для правядзення аналізу прэтэнзій, якія паступаюць, і ліквідацыі перашкод ва ўзаемным гандлі дзяржаў — удзельніц СНД.

Прэм'ер-міністр канстатаваў, што ў частцы лібералізацыі гандлю паслугамі важным з'яўляецца ўступленне ў сілу пагаднення аб свабодным гандлі паслугамі для ўсіх краін, якія падпісалі яго, і адзначыў той факт, што пагадненне ўжо ўступае ў сілу і для Рэспублікі Казахстан.

— Па-другое. Прадоўжыць фарміраванне навукова-тэхналагічнай прасторы СНД для дасягнення тэхналагічнага суверэнітэту. Пра важнасць гэтай тэмы ў кастрычніку мінулага года ў ходзе саміту Садружнасці гаварыў Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, — падкрэсліў Прэм'ер-міністр і прапанаваў у гэтай сувязі выканкаму СНД падумаць, дзе ў сферы тэхналогій бакі могуць выкарыстоўваць патэнцыял арганізацыі, каб развіваць сумесныя вытворчасці з высокай дабаўленай вартасцю.

Аляксандр Турчын таксама акцэнтаваў увагу на неабходнасці пашырэння ў Садружнасці прамысловай кааперацыі і павышэння ўзроўню лакалізацыі прадукцыі, што выпускаецца.

— Падпісанае сёння пагадненне аб супрацоўніцтве дзяржаў — удзельніц СНД у развіцці галін цяжкага машынабудавання павінна спрыяць гэтай мэце, — выказаў упэўненасць ён.

Трэцім кірункам, на якім акцэнтаваў увагу Прэм'ер-міністр Беларусі, з'яўляецца лічбавізацыя:

— Шырокае ўкараненне сучасных тэхналогій спрыяе эканамічнаму росту, павышэнню якасці паслуг, якія аказваюцца насельніцтву, — адзначыў ён.

Аляксандр Турчын канстатаваў, што рэалізацыя ў гэтай галіне сумесных праектаў, што ўяўляюць інтарэс для ўсіх дзяржаў — удзельніц СНД, надасць дадатковы імпульс шматпланаваму супрацоўніцтву на прасторы Садружнасці. Ён выказаў упэўненасць, што ад стварэння адзінай лічбавай прасторы ў рамках СНД выйграе як арганізацыя ў цэлым, так і кожная дзяржава-ўдзельніца.

Яшчэ адным кірункам узаемадзеяння ўдзельнікаў з'яўляецца ўмацаванне міжнароднага статусу СНД:

— Назапашаны вопыт узаемадзеяння дзяржаў-удзельніц ва ўсіх сферах, развітая нарматыўная прававая база дазваляюць Садружнасці актыўна пазіцыянаваць сябе на міжнароднай арэне, гучаць у міжнароднай інфармацыйнай прасторы. Чакаем ад Выканкама СНД больш рашучых дзеянняў па атрыманні статусу назіральніка пры Садружнасці Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, а таксама па ўдзеле ў мерапрыемствах, якія праводзяцца на пляцоўцы ААН і іншых міжнародных арганізацый.

### НАСТУПНАЯ СУСТРЭЧА — У МІНСКУ

Што тычыцца наступнай даты правядзення пасяджэння Савета кіраўнікоў урадаў СНД, запланаванай на 30 верасня ў Мінску, Аляксандр Турчын прасіў калег падтрымаць гэтую прапанову Выканкама СНД.

Таксама ён праінфармаваў, што адначасова плануецца правядзенне пасяджэння Еўразійскага міжурадавага савета пад старшынствам Беларусі.

Акрамя таго, у гэты ж перыяд — 29 верасня — 1 кастрычніка — упершыню ў Мінску будзе арганізавана Міжнародная прамысловая выстава «ІНАПРАМ. Беларусь».

### У тэму

#### На прынцыпах дружбы, узаемнай павагі і даверу

**У Палацы нацыі Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон сустрэўся з кіраўнікамі ўрадаў краін — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.**

На сустрэчы былі абмеркаваны пытанні супрацоўніцтва бакоў у рамках Садружнасці і парадку дня старшынства Таджыкістана ў СНД.

Эмамалі Рахмон выказаўся аб прыярытэтах старшынства Таджыкістана, у тым ліку аб мерах, якія прымаюцца краінай у кірунку развіцця і пашырэння адносін супрацоўніцтва і вырашэння актуальных пытанняў:

— Таджыкістан у рамках свайго членства і, у прыватнасці, цяперашняга старшыні ў СНД праводзіць работу па далейшым развіцці шматбаковага супрацоўніцтва паміж усімі дзяржавамі-ўдзельніцамі, — запэўніў ён. — Меры, што прымаюцца намі ў гэтым кірунку, заснаваны ў першую чаргу на прынцыпах дружбы, узаемнай павагі і даверу, узаемавыгаднага супрацоўніцтва і з улікам інтарэсаў усіх бакоў. У гэтым рэчышчы мы гатовы і далей садзейнічаць далейшаму пашырэнню ўзаемадзеяння ва ўсіх сферах супрацоўніцтва, у сферах забеспячэння ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця, а таксама ўмацавання стабільнасці і бяспекі на ўсёй прасторы Садружнасці.

Прэм'ер-міністр Беларусі запрасіў усе краіны СНД прыняць удзел у рабоце гэтага прэстыжнага мерапрыемства і прадставіць на ім экспазіцыі сваіх нацыянальных вытворцаў.

Аляксандр Турчын таксама прыняў удзел у пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў СНД у пашыраным складзе. Па выніках падпісаны шэраг дакументаў, якія датычацца:

— супрацоўніцтва дзяржаў у развіцці галін цяжкага машынабудавання і лёгкай прамысловасці;

— гарманізацыі нацыянальных сістэм арганізацыі паветранага руху;

— супрацоўніцтва ў галіне аховы здароўя насельніцтва;

— рашэння аб Форуме валанцёраў СНД;

— развіцця аб'яднанай сістэмы кантролю і ацэнкі радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абстаноўкі міністэрстваў абароны краін — удзельніц СНД;

— заснавання нагруднага знака «За развіццё турызму ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў»;

— міждзяржаўнай мэтавай праграмы «Рэкультывацыя тэрыторый дзяржаў, якія падвергліся ўздзеянню ўраназдабываючых вытворчасцяў».

### Гавораць удзельнікі

**Міхаіл МІШУСЦІН, старшыня Урада Расійскай Федэрацыі:**

— Для нашых дзяржаў рынак Садружнасці застаецца не проста значным. Ён з'яўляецца ключавым у знешнегандлёвым абароце. Па выніках мінулага года доля краін СНД у тавараабароце Расіі перавысіла 15,5 %. Гэта больш, чым годам раней.

У канцы 2024 года завяршыўся перыяд расійскага старшынства ў органах Садружнасці. Мы разам з вамі, паважаныя калегі, забяспечылі новую якасць нашай інтэграцыі, прынялі цэлы шэраг значных дакументаў у галіне энергетыкі, лагістыкі, інтэлектуальнай уласнасці, для ўмацавання харчовай бяспекі, развіцця транспартнага комплексу, стымулявання інавацый і павышэння прадпрымальніцкай актыўнасці.

Важным лічым і далейшае пашырэнне супрацоўніцтва СНД і Еўразійскага эканамічнага саюза. З улікам цесных сувязяў паміж нашымі краінамі неабходна працаваць над збліжэннем нарматыўна-прававога рэгулявання Садружнасці і Саюза.

**Алі АСАДАЎ, прэм'ер-міністр Азербайджана:**

— Азербайджан надае важнае значэнне далейшаму пашырэнню гандлёва-эканамічных сувязяў з дзяржавамі — членамі Садружнасці. У сувязі з гэтым прыемна адзначыць захаванне станоўчай дынамікі тавараабароту Азербайджана з краінамі СНД, які ў 2024 годзе вырас на 7 %. Па выніках 4 месяцаў бягучага года фіксуем прырост у 43 %.

**Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**извещает о проведении 19 июня 2025 г. в 10.00 повторного открытого аукциона с понижением начальной цены на 50 % после вторых несостоявшихся торгов по продаже**
**автомобиля BOGDAN 231010-31,**
**принадлежащего открытому акционерному обществу «Гомельстекло» на праве собственности**

| № лота | Наименование и характеристика объекта | Начальная цена, рублей (в т. ч. НДС 20 %) | Задаток, рублей (в т. ч. НДС 20 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль BOGDAN 231010-31,** регистрационный знак АМ 2488-3, 2010 года выпуска. Тип: грузовой фургон. Цвет: белый. Номер кузова (рамы) Y6L231010AL200219. Объем двигателя: 1597 см³. Вид топлива: бензин. Коробка передач: механическая | **4380,00** | **400,00** |
| **Местонахождение автотранспортного средства:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Михаила Ломоносова, 25 | | | |

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 2-7. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артёма, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 09.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 18.06.2025 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.
В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **19.06.2025 г.** Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.
**При подаче заявления участник должен иметь:** 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть и при себе иметь все данные по счету.
Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению, в газете «Звязда» от 06.06.2025 г.
Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 5 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в течение 10 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке.
Извещение о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту было опубликовано в газете «Звязда» от 19.02.2025 г. № 34, от 03.05.2025 г. № 85

**Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артёма, 23,**
**тел.: +375 232 32-46-47; 32-18-95; +375 29 170-46-47.**
**Сайт: gostorg.by • e-mail: auction-gino@gino.by.**
**Продавец: ОАО «Гомельстекло», г. Гомель, ул. Михаила Ломоносова, 25,**
**тел.: +375 29 615-55-20; +375 29 171-07-69**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) информирует о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **Кривосельскому сельскому исполнительному комитету** (Продавец) на праве оперативного управления.

**Электронные торги состоятся 24.06.2025.**

**Лот № 1:** LADA 21214 010-40, кузов (рама) № XTA212140G2243654.
Начальная цена без учета НДС – 7 500,00 руб.
**Местонахождение:** Минская обл., Вилейский р-н, аг. Кривое Село, ул. Первомайская, 10.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by, электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**
УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ
**Организатор: Государственное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство № 2 Фрунзенского района г. Минска»,**
*220104, г. Минск, ул. Матусевича, 42, тел. +375173600685.*

Торги проводятся **07.07.2025 г.**
ЭТП «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.**

**Право заключения договора аренды на изолированное помещение**
**с инв. № 500/D-708003996,**
**расположенное по адресу: г. Минск, ул. Неманская, д. 44, пом. 1Н.**
Окончание приема заявлений – **30.06.2025, до 15.00.**
Подробная информация на сайте **www.et.butb.by.**
УНП 192605364

# У СЛАВУ ЗАСТУПНІЦЫ БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ

## Спаса-Ефрасіннеўскі мітрапаліцкі жаночы манастыр па праву з'яўляецца духоўным цэнтрам Беларусі, месцам прыцягнення ўсіх хрысціян

Гэта адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА, віншуючы суайчыннікаў з 900-годдзем заснавання святой абіцелі. Падчас святкавання ў Полацку прывітальны адрас кіраўніка дзяржавы зачытала намеснік Прэм'ер-міністра, старшыня рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы святкавання юбілею манастыра Наталля ПЯТКЕВІЧ.

«Каля мошчаў прападобнай Ефрасінні Полацкай моляцца аб вылячэнні і суцяшэнні, з любоўю ў сэрцы дзякуюць за дапамогу, — сказана ў віншаванні. — На беларускай зямлі свята берагуць важную частку самабытнай культуры, звязанай з працай праваслаўнай падзвіжніцы. Завяршыўшы работы па рэстаўрацыі манастыра і аднавіўшы яго спрадвечную прыгажосць, мы зрабілі бясцэнны ўнёсак у захаванне гістарычнай спадчыны. Няхай пад перазвон вера ў Бога ўмацоўвае адзінства беларускага народа і прымнажае дасягненні краіны».



Менавіта пад патранатам Аляксандра Лукашэнкі выдзяляліся сродкі на рэканструкцыю ўнікальных фрэсак работы візантыйскіх майстроў, выкананых па заказе Ефрасінні Полацкай у пабудаваным ёй у XII стагоддзі храме Праабражэння Гасподня. З яго адкрыццём пасля рэстаўрацыі ў студзені гэтага года старажытныя фрэскі могуць разглядаць наведвальнікі.

Да віншаванняў далучылася Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля Качанава: «Дзевяць стагоддзяў таму нябесная заступніца Беларусі, імкнучыся да духоўнай дасканаласці, удыхнула ззянне веры ў Полацкую абіцель. З таго часу лёс нашай зямлі, які знаходзіцца пад аховай прападобнай Ефрасінні, непарыўна звязаны са Спаса-Ефрасіннеўскім манастыром — бясцэннай святыняй нашай благаслаўлёнай Айчыны».

У дзень памяці Святой Ефрасінні, 5 чэрвеня, усе шляхі вернікаў вялі ў Полацк. Менавіта ў гэты дзень, раз на год праходзяць святочныя набажэнствы ў Сафійскім саборы. Адтуль хрэсны ход, у якім узялі ўдзел тысячы праваслаўных, рушыў у Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр.

За многія стагоддзі ён перажыў як гады росквіту, так і цяжкія часы. Але малітвамі сваёй заснавальніцы і яе паслядоўнікаў застаецца аплотам веры, скарбніцай хрысціянскіх каштоўнасцяў. Галоўныя святыні абіцелі — мошчы і вярыгі матухны Ефрасінні, яе знакаміты крыж. 140 манашак штодня моляцца тут аб згодзе і спагадзе на беларускай зямлі. Толькі летась манастыр наведалі больш за 45 тысяч паломнікаў.



Боскую літургію ў Крыжаўзвіжанскай царкве ўзначаліў Святейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл, Першасвяцільскі візіт якога ў Беларусь прымеркаваны да 900-годдзя Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. Набажэнства прайшло надзвычай узнёсла, урачыста, вернікі аб'ядналіся ў гарачай малітве за мір, спакой і адзінства.

Праграма Першасвяціцельскага візіту ў Беларусь Прадстаяцеля Рускай праваслаўнай царквы была насычанай, але ў ёй вылучаўся адзін пункт, быццам бы не звязаны непасрэдна з царкоўным жыццём, разам з тым ён падкрэсліў духоўны подзвіг беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл напярэдадні ўрачыстасцяў, якія прайшлі 5 чэрвеня ў Полацку, усклаў вянок да манумента на плошчы Перамогі ў Мінску.

З асаблівым пачуццём і ўрачыстымі прывітаннямі ў той жа дзень яго чакалі вернікі каля Свята-Духава кафедральнага сабора сталіцы, дзе ў гонар дня памяці прападобнай Ефрасінні, ігумені Полацкай, адслужылі ютрань Усяночнага няспання. Вітаючы Святейшага Патрыярха Кірыла, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, паднёс яму ў падарунак абраз Жыровіцкай Божай Маці, выкананы ў камені сучаснымі майстрамі (сёлета адзначылі 555 гадоў яго з'яўлення). Яшчэ адзін падарунак — факсімільнае выданне Лаўрышаўскага Евангелля XIII стагоддзя. Патрыярх паднёс падарунак ад сябе — дарагі для яго абраз «Неўская Скорапаслушніца», да якога звяртаўся ў малітве ў цяжкія моманты жыцця.

У Першасвяціцельскім слове ён адзначыў, што прыязджае ў Беларусь з асаблівым пачуццём: гэта заходні фарпост праваслаўя, але ў людзях, якія тут жывуць, шмат сілы духу і веры. «Я ведаю, што ў Беларусі ёсць цудоўныя ўмовы для царкоўнага жыцця, — падкрэсліў Патрыярх. — Але давайце памятаць: усё тое, што напаўняе радасцю, з'яўляецца Божым дарам, які даецца нам па нашых справах, па нашай веры, па нашай вернасці Госпаду. І, можа, невыпадкова пасля дзесяцігоддзяў ганенняў надышоў дзіўны час для таго, каб спакойна хадзіць у храм, маліцца і адчуваць сябе праваслаўным хрысціянінам. Не павінна быць у нас прывыкання да добрага. Заўсёды павінна быць імкненне да Госпада і неабходна рабіць добрыя справы. Тады наступныя пакаленні вырастуць праваслаўнымі, якія захоўваюць традыцыі, што прывялі ў гэта зямное жыццё, сфарміравалі вялікіх Божых угоднікаў, якія, нібы зоркі, упрыгожваюць неба нашага духоўнага жыцця».

**Святлана ЯКАЎЛЕВА,**
**Ларыса ЦІМОШЫК.**





ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# ДЗЯРЖРЭГІСТРАЦЫЯ: ПРАСЦЕЙ, ЛЯГЧЭЙ, ХУТЧЭЙ

## Якія навацыі чакаюцца ў працэдурах рэгістрацыі і ліквідацыі суб'ектаў гаспадарання

У Палаце прадстаўнікоў рыхтуецца да разгляду ў першым чытанні праект закона «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненні дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання». Учора законапраект абмяркоўваўся на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў з удзелам кіраўніцтва Міністэрства юстыцыі.

«Праект закона «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненні дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання» ўнесены ў Палату прадстаўнікоў Саветам Міністраў 19 мая. Ён накіраваны на комплекснае рэгуляванне працэдур дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спынення дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання, вядзення Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў», — паведаміў **старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Віктар НІКАЛАЙКІН.** Ён адзначыў, што дакумент будзе ўнесены ў Авальную залу толькі пасля ўрэгулявання і ўзгаднення ўсіх заўваг, якія паступяць ад дэпутатаў і юрыдычных асоб. Таксама Віктар Нікалайкін звярнуў увагу на тое, што пры падрыхтоўцы законапраекта ўлічана практыка прымянення дзейных нарматыўных прававых актаў у гэтай сферы, уключаючы Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 студзеня 2009 года № 1 «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненні дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання».



Дакумент прадугледжвае шэраг навацый. Так, устанаўліваецца парадак дзяржаўнай рэгістрацыі юрыдычнай асобы на падставе тыпавога статута, што дазволіць скараціць колькасць дакументаў, якія падаюцца ў рэгіструючы орган. У асобных выпадках для стварэння юрыдычнай асобы спатрэбіцца толькі заява аб дзяржаўнай рэгістрацыі.

Таксама выключаецца выдача пасведчання аб дзяржрэгістрацыі юрыдычнай асобы. «У прыватнасці, юрыдычнай асобе, якая дзейнічае на падставе ўласнага статута, па выніках дзяржаўнай рэгістрацыі будзе выдавацца статут са штампам, а юрыдычнай асобе, якая дзейнічае на падставе тыпавога статута, — выпіска з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў», — удакладніў старшыня Пастаяннай камісіі.

Праектам закона прадугледжана пашырэнне падстаў уключэння і актуалізацыі звестак у Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў. «Гэта не толькі дакументы і звесткі, якія падаюцца заяўнікамі для дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі, дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй, але і атрыманыя з дапамогай інфармацыйнага ўзаемадзеяння названага рэгістра з іншымі інфармацыйнымі сістэмамі», — растлумачыў парламентарый.



Працягваючы тэму навацый, **міністр юстыцыі Яўген КАВАЛЕНКА** падкрэсліў, што законапраект накіраваны на далейшае ўдасканаленне адносін у сферы рэгістрацыі юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, а таксама іх наступнай перарэгістрацыі і спынення імі дзейнасці. Ён прадугледжвае больш актыўнае ўкараненне інфармацыйных тэхналогій, электроннага ўзаемадзеяння паміж дзяржаўнымі органамі.

Па словах кіраўніка ведамства, мяркуецца скарачэнне шэрагу працэдур, тэрмінаў разгляду гаспадарчых дакументаў, змяншэнне колькасці папер, якія падаюцца самімі суб'ектамі гаспадарання. Скарачаюцца з 5 да 3 дзён тэрміны пастаноўкі на ўлік суб'екта гаспадарання. Таксама прадугледжана фарміраванне электроннай рэгістрацыйнай справы, дзе будуць утрымлівацца ўсе неабходныя звесткі, якія адлюстроўваюць жыццёвы шлях суб'екта гаспадарання.

«Адной з прагрэсіўных навацый законапраекта з'яўляецца ўключэнне ў якасці абавязковага рэквізіту абавязковых звестак аб суб'екце гаспадарання — яго электроннай пошты. Так, напрыклад, цяпер для накіравання афіцыйных дакументаў выкарыстоўваецца ўказаны суб'ектам гаспадарання паштовы адрас, адрас рэгістрацыі юрыдычнай асобы. Мы ж уводзім у прававое поле адрас электроннай пошты, на які таксама будуць накіроўвацца неабходныя паведамленні», — адзначыў міністр.

Акрамя таго, законапраектам прадугледжваюцца зніжэнне адміністрацыйнай нагрузкі на суб'екты гаспадарання, умацненне абароны правоў і законных інтарэсаў крэдытораў.

**Паводле БелТА.**

# «МЫ Б ВЕЛЬМІ ХАЦЕЛІ НАРМАЛІЗАЦЫІ АДНОСІН»

## Далёка не ўсе дэпутаты Еўрапарламента падтрымліваюць палітыку санкцый і ізаляцыі

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў сустрэліся з дэпутатамі Еўрапарламента. Беларускія парламентарыі запрасілі сваіх еўрапейскіх калег у нашу краіну, каб найперш паказаць, што такое Беларусь, паказаць праўду. Дэпутаты з Чэхіі і Славакіі самі ўпэўніліся, што беларусы выступаюць за паважлівае і раўнапраўнае супрацоўніцтва з іншымі краінамі, пераканаліся, што беларусы не рыхтуюцца да вайны і не збіраюцца ні на кога нападаць, але і ў крыўду сябе не дадуць.



Фота sb.by

У Беларусі ў еўрапейскіх парламентарыяў насычаная праграма: яны наведалі выставу «Белагра», правялі шэраг сустрэч. Беларускія парламентарыі такую практыку будуць працягваць, у хуткім часе нашу краіну па запрашэнні калег наведаюць дэпутаты Аўстрыі, Францыі і ЗША.

**Мілан УХРЫК узначальвае славацкую партыю «Рэспубліка», у Еўрапарламенце займае пасаду віцэ-старшыні фракцыі «Еўропа суверэнных нацый», працуе ў Камітэце па грамадзянскіх свабодах, правасуддзі і ўнутраных справах.** «Па тым, што пішуць нашы СМІ, я думаў, што еду ў сапраўднае пекла. Але я на свае вочы ўбачыў нармальную краіну, у якой развіваецца прамысловасць, бізнес. Многае з таго, што кажуць у Еўропе пра Беларусь, — хлусня, — адзначыў ён у размове з журналістамі. — Гэтым візітам я б хацеў гучна і адкрыта заявіць, што мая партыя супраць палітыкі ізаляцыі і санкцый у адрас Беларусі. Мы б вельмі хацелі нармалізацыі адносін. Мы галасавалі супраць законапраекта ў Еўрапейскім парламенце, які быў накіраваны на санкцыі супраць беларускага калію, бо разумеем, што гэта нашкодзіць нашай сельскай гаспадарцы».

Каментуючы агрэсіўную палітыку Захаду ў адносінах да Беларусі, палітык падкрэсліў, што Еўропа баіцца ўсходніх краін:

— Таму што еўрапейскія палітыкі, уключаючы фон дэр Ляен, проста не спраўляюцца з кіраваннем Еўропай, прымаючы законы і правілы, якія яе руйнуюць, накшталт зялёнага парадку дня, які губіць нашу прамысловасць. У нас дрэнная міграцыйная палітыка, ЛГБТ-парадак дня разбурае нашы сем'і... А краіны Усходу, краіны БРІКС, Беларусь — на ўздыме. І заходнія краіны гэтага баяцца, палітыкі не ведаюць, што рабіць. Усё, што яны могуць, — уводзіць блакады, санкцыі і негатыў. Але гэта не шлях наперад.

Мілан Ухрык адзначыў, што пасля сваёй паездкі ў Беларусь ён упэўнены, што на радзіме сутыкнецца з крытыкай. «На самай справе я буду гэтаму нават рады, таму што перакананы: мы робім правільную справу на шляху да нармалізацыі адносін», — прызнаўся ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Лидахлебопродукт», Гродненская область, г. Лида, ул. Булата, 1. УНП 500022448. Тел. (0154) 65 25 01 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1: Цех подсобных промыслов** (инв. № 420/С-101787**, 206,7 кв. м**). Адрес: **Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, д. Огородники, ул. Новая, 1Г**.
***Сведения о земельном участке:*** пл. 0,0252 га предоставлен на праве аренды до 08.11.2071 для строительства и обслуживания здания цеха подсобных промыслов

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 28 874,22 бел. руб.** (снижена на 20 %)

**Лот № 2: Здание бани** (инв. №: 430/С-61953, **45,2 кв. м**).
Адрес: **Гродненская обл., Новогрудский р-н, Петревичский с/с, 50, здание бани юго-западнее д. Василевичи.**
***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,0691** га предоставлен на праве аренды по 29.07.2072 для строительства и обслуживания здания бани. Ограничения (обременения): придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильных дорог

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 2 462,84 бел. руб.** (снижена на 20 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней** после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. Расходы, связанные с государственной регистрацией сделки, несет покупатель

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере по лоту № 1 – 6 %, по лоту № 2 – 10 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения торгов

Предыдущая публикация извещения в газете «Звязда» 08.05.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 19.06.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 18.06.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37, +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ООО «БЕССЕР-БЕЛ»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 24.06.2025.**

**Лот № 1 в составе:**

**1. DAF TE95XF,** кузов (рама) XLRTE47XS0E639472, 2004 г. в.

**2. KOEGEL SN24,** кузов (рама) WK0S0002400075923, 2006 г. в.

Начальная цена с НДС 20 % – 117 828,00 бел. руб.
Задаток – 5 000,00 бел. руб.

**Местонахождение:** г. Минск, ул. Монтажников, 21.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **20.06.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**

УНП 190055182

ОБЪЯВЛЕНИЕ

**ОАО «МИНСКОБЛХЛЕБОПРОДУКТ»**
извещает, что совместное общее собрание акционеров ОАО «МИНСКОБЛХЛЕБОПРОДУКТ» и ОАО «Борисовхлебпром» состоится **16 июня 2025 г.** по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 2.
Начало собрания в 15.30. Регистрация участников с 15.00 до 15.25.
При себе иметь документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность

ПОВЕСТКА ДНЯ:
**1.** Об увеличении уставного фонда ОАО «МИНСКОБЛХЛЕБОПРОДУКТ».
**2.** О дополнительном выпуске акций ОАО «МИНСКОБЛХЛЕБОПРОДУКТ».
**3.** О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «МИНСКОБЛХЛЕБОПРОДУКТ»

***Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт», тел. 282-57-57.***

УНП 600013173

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

**Унитарное предприятие**

**«Могилевское отделение БелТПП»**

**08 июля 2025 г. в 14.00**

**проводит торги**

**по продаже следующих объектов**

| № п/п | Наименование объекта продажи | Начальная цена продажи с учетом НДС 20 %, белорусских рублей | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | **Автомобиль Honda CR-V** регистрационный знак 5267ЕЕ-6 (легковой джип), кузов № 5J6RE48308L002298, 2008 года выпуска | 13544,00 (тринадцать тысяч пятьсот сорок четыре) белорусских рубля, в том числе НДС 20 % в сумме 2257,33 белорусских рублей | 1354,40 (Одна тысяча триста пятьдесят четыре рубля 40 копеек) |

**Собственник имущества:**

ОАО «Лента», 212003, г. Могилев, ул. Челюскинцев, 65, Республика Беларусь, УНП 700002794, тел. для осмотра объектов продажи +375297411415.

**Организатор торгов:** Унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY88ALFA30122641790010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Могилев, BIC: ALFABY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

**Условия регистрации, участия в торгах, фото объекта продажи размещены на интернет сайте организатора по адресу: www.mogilev.cci.by.**

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 рабочих дней после проведения торгов.

Срок оплаты за предметы торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

**Торги состоятся 08 июля 2025 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».**

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 09.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112.

**Последний срок подачи заявления – 07 июля 2025 г. до 12.00.**

Регистрация участников торгов 08 июля 2025 г. с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: (0222) 778032, +375 44 735 00 30 – Жилина Ольга Александровна

УНП 192975600

**ИЗМЕНЕНИЯ**

**В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ**

**«Жилая многоквартирная застройка с объектами общественного назначения на пересечении пр-та Дзержинского и ул. Щорса в г. Минске»**

(2-й очереди строительства и 3-й очереди строительства)
(3-я очередь строительства, 3-й пусковой комплекс)
(3-я очередь строительства, 2-й пусковой комплекс),
*опубликованную в газете «Звязда» от 14.03.2024*

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

**в жилом доме № 2 по генплану** (3-я очередь строительства, 3-й пусковой комплекс):

- 46 (сорок шесть) однокомнатных квартир площадью 42-74 кв. м стоимостью 1 кв. метра от 1600,00 до 2000,00 долларов США с обязательным условием приобретения не менее (1) одного машино-места в многоуровневом надземном гараже-стоянке № 8 по генплану (3-я очередь строительства, 2-й пусковой комплекс) либо многоуровневом надземном гараже-стоянке, расположенном по адресу: г. Минск, ул. 2-я Землемерная, д. 23;

- 34 (тридцать четыре) двухкомнатные квартиры площадью 57-93 кв. м стоимостью 1 кв. метра от 1420,00 до 1850,00 долларов США с обязательным условием приобретения не менее (1) одного машино-места в многоуровневом надземном гараже-стоянке № 8 по генплану (3-я очередь строительства, 2-й пусковой комплекс) либо многоуровневом надземном гараже-стоянке, расположенном по адресу: г. Минск, ул. 2-я Землемерная, д. 23.

Стоимость квадратного метра строящегося объекта долевого строительства либо готового объекта недвижимого имущества формируется застройщиком в зависимости от этажа, площади и условий оплаты.

Условия оплаты квартиры: полная либо поэтапная оплата цены договора создания объекта долевого строительства в соответствии с действующими у застройщика условиями рассрочки по установленному Национальным Банком Республики Беларусь курсу белорусского рубля к доллару США на дату зачисления денежных средств на счета застройщика.

Условия оплаты машино-места: полная либо поэтапная оплата цены договора создания объекта долевого строительства или полная либо поэтапная оплата цены договора купли-продажи недвижимого имущества в соответствии с действующими у застройщика условиями рассрочки по установленному Национальным Банком Республики Беларусь курсу белорусского рубля к доллару США на дату зачисления средств на счета застройщика.

Ознакомиться с планировками квартир и машино-мест можно по предварительной записи в офисе продаж ЖК «Квартал на Грушевке» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 34, пом. 269 – по графику пн – пт с 09.00 до 18.00, сб, вс – выходной, либо на сайте Grushevka.by.

Приём заявлений на заключение договоров будет осуществляться в офисе продаж ЖК «Квартал на Грушевке» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 34, пом. 269, с 09.00 дня, следующего за днём опубликования настоящего изменения в проектную декларацию

# КАНСАЛІДАЦЫЯ

## У Гомелі стартаваў V Форум медыйнай супольнасці

Сёлета форум упершыню ахапіў адразу шэсць гарадоў Гомельскай вобласці. Таксама першы раз ён праходзіць у двухдзённым фармаце. Да ўдзелу ў V Форуме медыйнай супольнасці Беларусі заяўлена каля тысячы чалавек. Гэта не толькі супрацоўнікі вядучых беларускіх СМІ, рэгіянальнай прэсы, але і прадстаўнікі дзяржорганаў, прэс-службаў, блогеры, медыяэксперты і аналітыкі.



У Рагачове сустрэлі дэлегацыю Віцебскай вобласці, у Светлагорску — Гродзенскай, у Жлобіне — Мінскай, у Мазыры — Брэсцкай, у Рэчыцы — Магілёўскай. Гасцей з Мінска прынялі ў Гомелі.

Удзельнікі форуму наведалі знакавыя месцы памяці, аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны, пазнаёміліся з вядучымі прадпрыемствамі раёнаў Гомельшчыны. У гарадах, якія прымаюць гасцей з рэгіёнаў, прайшлі тэматычныя панэльныя дыскусіі з удзелам вядучых беларускіх СМІ і майстар-класы ад вядомых беларускіх журналістаў.

Рэчыца стала месцам правядзення панэльнай дыскусіі, арганізаванай Выдавецкім домам «Беларусь сегодня». Удзельнікі абмеркавалі тэму «Канвергентнае распаўсюджванне патрыятычнага кантэнту. Фокус на праўду». Размова ішла аб тым, як забяспечыць якаснае прасоўванне дзяржаўных прыярытэтаў праз розныя медыяплатформы і фарматы, не губляючы пры гэтым дакладнасці і глыбіні падачы матэрыялу.

Асобная ўвага ў гэтым годзе на форуме — юным журналістам, юнкарам раённых рэдакцый. Так, у Рагачове дэлегацыю з Віцебскай вобласці сустрэлі на базе раённага Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі. Тут прайшла прэзентацыя школы маладога журналіста «МЕДЫЯ-МОЛ» і студыі «Пазітыў-ТБ». Моладзь абмяркоўвала тэму «Журналістыка будучыні: ад дзіцячага юнкара да прафесіі», абазначалі вектары развіцця прафесійных інтарэсаў.

У Светлагорску, дзе прымалі прадстаўнікоў Гродзенскай вобласці, прайшла прэзентацыя маладзёжнай рэдакцыі «New FISHкі» і тэлестудыі «Ювента». Гэтыя праекты становяцца сапраўднай кузняй кадраў для айчыннай журналіс-

УСТУПНАЯ КАМПАНІЯ — 2025

# НА ЎСЕ СТО!

## Для праходжання ЦТ 5 чэрвеня зарэгістраваліся амаль 30,9 тысячы абітурыентаў

Учора прайшло тэсціраванне па другім профільным прадмеце. Яго ўдзельнікі здавалі гісторыю Беларусі, грамадазнаўства, хімію і фізіку — прадметы, якія неабходны для паступлення на такія спецыяльнасці, як юрыспрудэнцыя, паліталогія, журналістыка, сацыялогія, культуралогія і педагогіка. Хімія і фізіка — для тых, хто паступае на тэхнічныя, прыродазнаўчанавуковыя і медыцынскія спецыяльнасці.

На пляцоўцы ўніверсітэцкага гарадка БДУ, што на Ленінградскай, 8, апошнія тыдні шматлюдна. Выпускнікі гэтага і мінулых гадоў, абітурыенты, якія спрабуюць сябе паўторна, тоўпяцца ў асноўным каля вывешаных спісаў: у якім корпусе і якой аўдыторыі будзе праходзіць тэсціраванне па тым ці іншым прадмеце?

Экзаменаваных прымалі тры корпусы ўніверсітэта, у якіх размяшчаюцца юрыдычны, хімічны і фізічны факультэты. Абітурыенты хвалююцца, што могуць заблытацца, не знайсці патрэбны будынак. Але ім дапамагае валанцёр — студэнтка першага курса эканамічнага факультэта БДУ Арына. Разрульваць патокі ўсхваляванай моладзі ў яе атрымліваецца спрытна: адно пытанне, адзін адказ, і абітурыент ужо спяшаецца па зададзеным напрамку.

— Я хоць і заканчваю першы курс, але ўспаміны, як усё гэта праходзіла ў мяне, яшчэ жывыя, — дзеліцца дзяўчына. — Хваляванне і разгубленасць не лепшыя памочнікі на тэсціраванні. Таму ім патрэбна вось такая — хоць і невялікая, але дзейсная дапамога.

## НА КАГО ВУЧЫЦЦА, КАБ З ВЫБАРАМ НЕ ПАМЫЛІЦЦА

З 7 красавіка да 16 чэрвеня 2025 года праходзіць апытанне па вызначэнні патрэбы эканомікі ў кадрах да 2030-га. Папярэдняе апытанне адбылося летась.





### ПА ДАНЫХ АПЫТАННЯ 2024 ГОДА ЭКАНОМІЦЫ КРАІНЫ ПАТРЭБНЫ:

- ✓ кваліфікаваныя рабочыя з сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыяй. Менавіта яны фарміруюць касцяк рэальнага сектара эканомікі, забяспечваючы стабільную работу прамысловасці.
- ✓ спецыялісты з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія забяспечваюць тэхналагічнае развіццё і кіраўніцкія працэсы (практычна трацiна ад усіх патрэб).
- ✓ таксама захоўваецца патрэба ў некваліфікаваных рабочых для асобных галін.



### ТОП-5 САМЫХ ЗАПАТРАБАВАНЫХ ПРАФЕСІЙ



- ✓ Кіроўцы грузавікоў
- ✓ Машыністы сельгастэхнікі
- ✓ Медсёстры
- ✓ Мантажнікі і слесары
- ✓ Станочнікі і наладчыкі



*Гэтыя даныя яскрава ілюструюць, што кваліфікаваныя рабочыя — тыя самыя «сінія каўнерыкі» — па-ранейшаму складаюць аснову вытворчага патэнцыялу краіны. Такі трэнд захаваецца ў найбліжэйшыя гады, што патрабуе асаблівай увагі да развіцця сістэмы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, павышэння прэстыжу рабочых прафесій сярод моладзі.*

*Найбольшая патрэба ў кадрах адзначаецца ў апрацоўчай прамысловасці. Таксама неабходныя кваліфікаваныя рабочыя для машынабудавання, электронікі, будаўніцтва.*

# ГУЛЬЦОЎ ІНФАПОЛЯ

## Беларусі «Медыя сёння: фокус на праўду»

тыкі, выхоўваючы новае пакаленне медыйшчыкаў, гатовых працаваць у няпростых умовах сучаснага інфармацыйнага парадку дня.

Жлобін стаў пляцоўкай для вострай і актуальнай дыскусіі, арганізаванай тэлеканалам СТБ. Удзельнікі — прадстаўнікі рэдакцый Мінскай вобласці, юныя карэспандэнты і эксперты — абмяркоўвалі выклікі лічбавай эпохі: ці патрэбны СМІ сацсеткі і агрэгатары, як адрозніць фэйк ад праўды, справіцца з дыпфэйкамі і захаваць давер аўдыторыі. Гучалі вострыя пытанні: як адаптаваць традыцыйныя фарматы да лічбавага асяроддзя? Як сумяшчаць эфір і анлайн-кантэнт, каб быць цікавымі моладзі?

Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны стаў пунктам прыцягнення для гасцей з Мінска. Тут прайшла панэльная дыскусія на тэму «Узаемадзеянне платформ: як традыцыйныя і новыя медыя фарміруюць сучасны інфармацыйны ландшафт». Мадэратарам сустрэчы выступіла Кацярына Тумас-Цішкевіч, загадчык аддзела



інфармацыйна-аналітычных праграм тэлеканала АНТ, а спікерамі — палітычны аглядальнік Глеб Лаўроў, дырэктар дырэкцыі інтэрнэт-вяшчання АНТ Павел Савельеў. Удзельнікі казалі пра сінергію паміж традыцыйнымі і лічбавымі СМІ, пра ўменне адаптавацца да запытаў аўдыторыі і захоўваць давер, нягледзячы на ўзмацненне канкурэнцыі з блогасферай.

— На сёння самыя вялікія выклікі, якія стаяць перад журналістамі, — нават не ў тым, што ў кожным інфармацыйным акце супрацьстаяння мы ваюем чужой зброяй, нам даводзіцца купляць патроны перад кожнай атакай. Калі ў вас ёсць магчымасць данесці хаця б адно сваё слова, вы абавязаны гэта рабіць. У гэтым — ваш выклік, і ў гэтым — самае цяжкае, — падкрэсліў у сваім выступленні палітычны аглядальнік Глеб Лаўроў.

Дырэктар дырэкцыі інтэрнэт-вяшчання АНТ Павел Савельеў падзяліўся актуальнымі трэндамі вядзення сацсетак, распавёў аб некаторых сакрэтах прасоўвання пастоў і магчымасцях выкарыстання сэрвісаў штучнага інтэлекту для стварэння кантэнту.

Праграма другога дня форуму збярэ ўсіх удзельнікаў на вялікае пленарнае пасяджэнне, дзе пройдуць выступленні і жывыя зносіны з вядучымі медыяэкспертамі Беларусі. У рамках форуму адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў і лаўрэатаў XXI Нацыянальнага конкурсу «Залатая літара». Падрабязнасці — у наступным нумары «Звязды».

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота аўтара і БелТА.**

---

— У групе дзяжурных па забеспячэнні прапускнога рэжыму ў нас адпрацавалі 72 валанцёры, — расказвае **прарэктар БДУ намеснік старшыні арганізацыйнай камісіі па правядзенні ЦЭ і ЦТ ва ўніверсітэце Віктар КОЧЫН.** — Агульная колькасць арганізатараў склала 796 чалавек, сярод іх — 120 настаўнікаў.

Арганізацыю працэсу ЦТ прарэктар БДУ ацэньвае станоўча.

— Усё, што датычыцца патрабаванняў па правядзенні тэсціравання, ужо адладжана і выконваецца: гэта і пітны рэжым, і рассадка, арганізацыя ўваходу і здачы рэчаў і многае іншае — для нас усё гэта ўжо стандартныя, адпрацаваныя маніпуляцыі, — кажа Віктар Кочын.

Што да парушэнняў падчас ЦЭ і ЦТ, то іх, па словах намесніка старшыні аргкамісіі, сёлета зафіксавана значна менш, чым у 2024-м.

— Парушэнняў не проста стала менш, — адзначае суразмоўца. — Яны адзінкавыя. Таму разглядаць іх як нейкую сістэмную рэч сёння не мае сэнсу. Парушаюць часам з-за няпамятлівасці, няўважлівасці. За два ЦЭ і адзін ЦТ у нас быў усяго адзін выпадак, калі мы выдалілі абітурыента за спісванне.




Пляцоўка каля карпусоў юрыдычнага і хімічнага факультэтаў БДУ паступова апусцела, да іспытаў заставалася дзесяць з невялікім хвілін, і моладзь праводзіла час да пачатку ЦТ ужо ў сваіх аўдыторыях. Заўважаем хлопца, які спяшаўся да пункта здачы. На хаду цікавімся: «Як настрой, якія планы?»

— Настрой баявы: не спазніўся — ужо добра, — гэтак жа на хаду адказвае ён. — А планы? Здаць на ўсе сто!

Мы ж нагадваем, што ўдзельнік ЦТ, які не з'явіўся на іспыт або вызвалены па ўважлівых прычынах, праходзіць яго ў рэзервовыя дні і (або) іншыя тэрміны. Рэзервовымі днямі для ЦТ вызначаны 19, 21, 23 чэрвеня. Зарэгістравацца на іх можна будзе з 9 да 12 чэрвеня.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

---

## ВЫКАРЫСТОЎВАЕМ СЯМЕЙНЫ КАПІТАЛ НА ВУЧОБУ



### ЯКІЯ ЎМОВЫ?

- ✓ Скарыстацца сродкамі можна датэрмінова, не чакаючы 18-годдзя дзіцяці.
- ✓ Аплаціць можна сярэднюю спецыяльную або вышэйшую адукацыю ў дзяржаўных установах, а таксама ў навучальных установах спажывецкай кааперацыі і Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.
- ✓ Можна аплачваць навучанне ўсіх членаў сям'і (бацькоў, дзяцей, мужа і жонкі) на любой форме атрымання адукацыі: вочнай, завочнай, дыстанцыйнай.



### ЯК АФОРМІЦЬ АПЛАТУ?



1 **ПАДРЫХТУЙЦЕ ДАКУМЕНТЫ:**
- ✓ пашпарт заяўніка;
- ✓ рашэнне аб прызначэнні сямейнага капіталу;
- ✓ дагавор з навучальнай установай;
- ✓ даведка аб тым, што дзіця з'яўляецца студэнтам (навучэнцам).

2 **ПАДАЙЦЕ ЗАЯВУ**
ў службу «Адно акно».

3 Пасля прыняцця рашэння аб датэрміновым распараджэнні **ЗВЯРНІЦЕСЯ Ў БЕЛАРУСБАНК** для пералічэння сродкаў на рахунак навучальнай установы.



*Тэрмін разгляду заявы ў выканкаме — да 1 месяца.*
*Тэрмін пералічэння сродкаў у банку — 31—41 дзень.*

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Остромечево», 225034, Брестская обл., Брестский район, аг. Остромечево, пл. Октябрьская, д. 2 |
| **Оператор/ адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: Здание** (Здание неустановленного назначения), инв. № 100/С-90020, общ. пл. 350,5 кв. м, адрес: ***Брестская обл., г. Брест, ул. Тереспольская, 24А.***
**Сведения о земельном участке**: общ. пл. 0,1086 га, предоставлен продавцу для строительства и обслуживания здания неустановленного назначения на праве аренды по 30.11.2028

**Начальная цена лота, с НДС 20 % – 91 368,00 бел. руб.**
Шаг аукциона – 4 568,40 бел. руб.

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** календарных дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты объекта, такая оплата должна быть произведена в течение **20 (двадцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано газете «Звязда» от 16.04.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 20.06.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 19.06.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37, +375 (29) 154-34-35.**
**E-mail: auction@cpo.by**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **государственному предприятию «НИИ Белгипротопгаз»**
на праве хозяйственного ведения **(Продавец)**

**Электронные торги состоятся 09.07.2025.**

**Лот № 1:** UAZ 23632 136,
кузов (рама) № 236300С0532024 ХТТ236320С0023712, 2013 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 7 560,00 руб.

Местонахождение: г. Минск, ул. Стебенева, 14.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**

УНП 190055182

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **РУП «Издательство «Белбланкавыд»** (Продавец)
на праве хозяйственного ведения

**Электронные торги состоятся 25.06.2025.**

**Лот № 1:** ZOTYE E200,
кузов (рама) № LJ8E3C1M2JD322551 Y3WE3C1M2JB000005.
Начальная цена с НДС 20 % – 17 808,00 руб.

**Лот № 2:** ZOTYE E200,
кузов (рама) № LJ8E3C1M9JD322448 Y3WE3C1M5JB000015.
Начальная цена с НДС 20 % – 17 556,00 руб.

Местонахождение Лотов №№ 1–2:
г. Минск, ул. Кнорина, 17.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**

УНП 190055182

# ДОБРА, АЛЕ ХОЧАЦЦА ЯШЧЭ ЛЕПШ

**Якія пытанні сёння хвалююць жыхароў горада-спадарожніка**

У лютым 2025-га жыхарка Фаніпаля Юлія Барысаўна, якая пражывае ў адным з новых мікрараёнаў горада, прыйшла на прыём грамадзян да Аляксандра Турчына (тады ён займаў пасаду старшыні Мінскага аблвыканкама. — «**Зв.**»). Жанчына разам з мужам больш за 10 гадоў таму атрымала зямельны ўчастак у гэтым мікрараёне — там не было яшчэ ні дарог, ні транспартных зносін. Сям'я вырашыла, што гэта часовыя нязручнасці. Аднак і да нядаўняга часу ў Паўднёвым-2 была бездараж, а ў школу, якая знаходзіцца за два кіламетры ад дома, дзеці былі вымушаны хадзіць пешшу. Тады Аляксандр Турчын, цяперашні Прэм'ер-міністр, даручыў вырашыць пытанне з дарогай тэрмінам да 1 чэрвеня. Карэспандэнты «Звязды» наведалі Фаніпаль, каб праверыць, ці выканалі адказнае даручэнне, а заадно даведацца, якія яшчэ пытанні хвалююць жыхароў горада-спадарожніка Мінска.

## ДАРОГІ, ТРАНСПАРТ, МОСТ І ПАРК

У мікрараён Паўднёвы-2 мы заехалі ўжо па новай асфальтаванай дарозе, каля якой нас сустрэлі Юлія Барысаўна і яе суседка Ганна Анатольеўна. Маладыя мамы разам з маленькімі дзецьмі ў калясках не без задавальнення гулялі па пешаходнай дарожцы. Раней і яе ў мікрараёне не было, як і саміх транспартных зносін. «Аўтобус на той час аб'язджаў нас зусім, у мікрараён наогул нічога не заходзіла, бо не было асфальту. Нашым дзецям трэба было ісці ў школу ад 2 да 2,5 кіламетра па гразі, праз чыгуначны пераезд», — успамінае Юлія Барысаўна.

Больш за два гады жанчына аббівала парогі мясцовых улад: хадзіла на прыёмы грамадзян, тэлефанавала на гарачыя лініі, але ўсё безвынікова. Прычыны знаходзіліся, здавалася б, аб'ектыўныя: то грошай на будаўніцтва няма, то генпланамі асфальтаваная дарога не прадугледжана... Апошняя надзея, працягвае расказ фаніпальчанка, была на Аляксандра Турчына: «Я ўжо і не ведала, да каго мне звярнуцца, калі і ён не дапаможа... Ішла на прыём да губернатара і перажывала, што мы ў чарговы раз атрымаем адмову. На шчасце, памылілася. Як вынік — сёння ў нас і добрая дарога, і транспартныя зносіны, а ў наступным навучальным годзе нашы дзеці нарэшце паедуць у школу на аўтобусе!»

Але не толькі гэта праблема, як высветлілася, сёння хвалюе фаніпальчан. «Чаму ў Дзяржынску (райцэнтры, Фаніпаль — горад раённага падпарадкавання. — **Аўт.**) і дарогі, і сучасныя пляцоўкі, і добрыя паркі, і развітая інфраструктура, а ў нас усяго гэтага значна менш, хоць па колькасці насельніцтва наш горад не нашмат адстае? Так, нам кажуць, і мы гэта самі бачым, што за апошнія гады Фаніпаль зрабіў вялікі рывок. Мы насамрэч удзячныя, бачым прагрэс. Узвялі і басейн, і дзіцячы садок, і школу новую будуюць, парк павінны зрабіць, але ў параўнанні з Дзяржынскам мы ўсё роўна адчуваем сябе абдзеленымі», — наракаюць маладыя жанчыны.

Яшчэ адна вострая праблема, якая хвалюе жыхароў горада-спадарожніка, — стан пешаходнага моста цераз чыгуначны пераезд. Апошні злучае жылую і прамысловую зоны, людзі актыўна ім карысталіся. «І вось ужо гадоў пяць ён стаіць разбураны, закінуты, нікому не патрэбны! — скардзяцца мясцовыя жыхары. — Доўгі час ён быў «нічыйны», было не зразумела, у каго ён лічыцца на балансе: у горада ці ў чыгункі. У выніку шматлікіх судоў пешаходны мост перадалі на гарадскі баланс. Мы разумеем, што на яго аднаўленне патрэбны і час, і грошы... Але людзі штодня, парушаючы закон, на свой страх перабягаюць цераз чыгуначныя пуці, бо для таго каб бяспечна абысці чыгуначны пераезд, неабходна прайсці два кіламетры! Натуральна, практычна ніхто так не робіць, а аўтамабілі ў гадзіны пік ствараюць затор... Мы, звычайныя людзі, гатовы падключыцца да вырашэння гэтай праблемы, але толькі нашымі намаганнямі зрабіць новы мост, вядома, не атрымаецца...»


Дарогі асфальтуюцца...





...мост чакае свайго часу.

## НА СУВЯЗІ З УЛАДАЙ

Па адказы на пастаўленыя пытанні адпраўляемся да мясцовых улад, дзе атрымліваем падрабязнае тлумачэнне. Як пераканаліся, сёння сапраўды вядзецца актыўная работа па добраўпарадкаванні Фаніпаля. «Згадзіцеся, любы чалавек, асабліва ў абвешчаны кіраўніком дзяржавы Год добраўпарадкавання, хоча, каб усё было добра і адразу, — заўважыў **старшыня Фаніпальскага гарвыканкама Аляксандр САРАКАЧ**. — Мы заўсёды фарміруем планы на наступны год і ўсімі сіламі імкнёмся іх выконваць. На самай справе ў сілу сваіх магчымасцяў летась зрабілі многае: памянялі тратуары і бардзюры ў дварах, паклалі новы асфальт. Цяпер займаемся добраўпарадкаваннем нашага горада. Сёння дзякуючы раённым уладам мы робім свой гарадскі парк. Там будуць тратуары, каб нашым людзям было зручна хадзіць і адпачываць. Многае робіцца і для дзяцей: у парку ўстановяць звыш 90 лавак, сучасныя спартыўныя і воркаўт-пляцоўкі, уладкуюць міні-футбольнае поле, валейбольную пляцоўку. Мы абмяркоўвалі са старшынёй Дзяржынскага райвыканкама, што пасля ўводу аб'екта абавязкова сустрэнемся з людзьмі і абмяркуем, што яшчэ ім хацелася б бачыць у новым парку, выслухаем пажаданні і прапановы».

Наракалі грамадзяне і на перапоўненыя школы. «Таму з 1 верасня адчыніць свае дзверы новая школа на 1050 месцаў. Там будуць і выдатны стадыён, і басейн, і многае іншае. Навучальная ўстанова — адна з найпрыгажэйшых ва ўсёй краіне — разгрузіць дзве існуючыя ў нашым горадзе, якія разлічаны на 820 вучняў, а па факце іх колькасць перавышана практычна ў два разы. Горад актыўна забудоўваецца, да нас прыязджаюць маладыя і шматдзетныя сем'і, яго насельніцтва ўжо налічвае амаль 19 тысяч чалавек. Сёння актыўна будуюцца і новыя дамы, і новы мікрараён. А яшчэ ў нас запланавана ўзвядзенне новага гандлёвага цэнтра плошчай прыкладна ў тры тысячы «квадратаў». Упэўнены, ён нічым не саступіць гандлёвым цэнтрам сталіцы».

Пра пешаходны мост цераз чыгунку. Гэта пытанне ўжо вырашаецца. «Безумоўна, такая праблема існуе, — прызнае кіраўнік горада. — У нас заключаны дагавор з падраднымі арганізацыямі, заказчыкам выступае ЖКГ. Наколькі вядома, падрадная арганізацыяй выступіць філіял «Мостабудаўнічае ўпраўленне № 2» ААТ «Мастабуд», якое размешчана ў суседняй вёсцы Вязань. Гэта спецыялізаваная арганізацыя займаецца рамонтам маставых канструкцый. На яе ўся надзея, бо людзі вымушаны аб'язджаць, у гадзіны пік утвараюцца заторы...»

Штогод у Фаніпалі рамантуюць дамы, дваровыя тэрыторыі, вуліцы. «Мы імкнёмся ліквідаваць усе праблемныя моманты. Актыўна займаемся і добраўпарадкаваннем у часткі высадкі дрэў, упрыгожваем горад як можам. Вядома ж, хацелася б дзесьці і больш, і лепш. Але зыходзім з тых магчымасцяў, якія ў нас ёсць, прыцягваем насельніцтва да работ па добраўпарадкаванні, заклікаем да падтрымання парадку, асабліва ў прыватным сектары», — падкрэсліў Аляксандр Саракач.

«Фаніпальчане такія людзі (а я магу меркаваць, паколькі сам мясцовы), якія хочуць усё і адразу, — заўважае кіраўнік горада. — Але трэба разумець, што грошы на развіццё паступаюць з раённага і абласнога бюджэтаў. А акрамя Фаніпаля і Дзяржынска ёсць у раёне і вёскі, і аграгарадкі, і іншыя населеныя пункты, якія таксама неабходна развіваць. Мы, старажылы, цудоўна памятаем, якімі былі і Дзяржынск, і Фаніпаль раней. Таму з упэўненасцю магу заявіць — для нашага горада з боку ўлад робіцца вельмі шмат».

## А ШТО Ў ДЗЯРЖЫНСКУ КАЖУЦЬ?

За апошнія некалькі гадоў Фаніпаль зрабіў вялікі крок у развіцці. Тут былі рэалізаваны дзясяткі праектаў у самых розных кірунках. Агулам за тры гады на развіццё Фаніпаля выдаткавана звыш 90 мільёнаў рублёў. Што яшчэ было зроблена і якія перспектывы ў населенага пункта, расказалі **намеснік старшыні Дзяржынскага райвыканкама Аляксандр ПІШЧЫК і дырэктар ДП «УКБ Дзяржынскага раёна» Дзяніс ПРАКОПЧЫК**.

Да нядаўняга часу ў Фаніпалі былі праблемы з водазабеспячэннем. Да іх вырашэння кіраўніцтва раёна падышло комплексна: правялі перакладку асноўных магістральных сетак, узвялі чатыры новыя артэзіянскія свідравіны і дадатковы рэзервуар на 2 тысячы кубаметраў вады. «Водазабеспячэнне ў горадзе сёння наладжана», — адзначае намеснік старшыні райвыканкама.

Вялікі рывок зроблены і ў частцы добраўпарадкавання мясцовых дарог. Апошнім часам у Фаніпалі пераклалі асфальт на асноўных магістральных вуліцах. Таксама з жыхарамі горада рэалізавалі пілотны праект. За свой кошт людзі ўстанаўлівалі дарожныя барты, а камунальная служба па-за чаргой асфальтавала гэтыя ўчасткі. Актыўна вялося і будаўніцтва інжынернай інфраструктуры. Завяршыўся маштабны праект — менавіта ў Фаніпалі з'явілася першая ў раёне чатырохпалоска.

Жылая забудова ў горадзе-спадарожніку з улікам яго імклівага развіцця і блізкасці да сталіцы расце не па днях, а па гадзінах. Пры ўзвядзенні шматкватэрных жылых дамоў асаблівая ўвага ўдзяляецца стану і напаўненню дваровых тэрыторый. «Акрамя асфальтавання двароў, уладкавання тратуараў і парковак вельмі запатрабаваны разнапланавыя дзіцячыя гульнявыя зоны і спартыўныя пляцоўкі для дарослых. Мы стараемся максімальна ўлічыць патрэбы і запыты жыхароў. На прыкладзе новага мікрараёна па вуліцы Зялёнай можна ўбачыць, якім чынам маюць намер добраўпарадкоўваць дваровыя тэрыторыі. Гульнявыя лакацыі — гэта не проста дзіцячыя пляцоўкі, але і футбольнае поле, баскетбольная зона, пляцоўка для гульні ў гарадкі, вулічныя трэнажоры, — кажа намеснік старшыні. — Падчас добраўпарадкавання прылеглых тэрыторый ствараем і рэкрэацыйныя месцы для жыхароў. Так, пры рэалізацыі інвестыцыйнага праекта наведзены парадак на старым гарадскім возеры. Сёння яно паглыблена, ачышчана, акультурана. Вакол вадаёма пракладзены пешаходныя дарожкі, устаноўлены лавачкі і мачты асвятлення».

Наступным важным крокам у развіцці горада стане ўзвядзенне новага будынка паліклінікі. Рэалізацыя праекта запланавана на 2025—2026 гады. Пасля пераезду медыкаў стары будынак плануем рэканструяваць у дзіцячую школу мастацтваў — такой установы сёння не хапае маленькім фаніпальчанам, ведаюць у райвыканкаме.

Як відаць, раённыя ўлады Фаніпаль увагай не абдзяляюць. Не заўсёды атрымліваецца «усё і адразу», але ж і ў жыцці так рэдка бывае.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**
*г. Фаніпаль.*

## Панядзелак, 9 чэрвеня

### Беларусь 1

6.00, 7.15, 8.20 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
7.50 Слова Архібіскупа Юзэфа Станеўскага на ўрачыстасць Найсвяцейшага Цела і Крыві Хрыста.
8.15, 18.45 Зона X (16+).
8.50 Выпускныя экзамены па беларускай мове, рускай мове і матэматыцы за перыяд навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі (з сурдаперакладам).
9.15 Галоўны эфір.
**10.50, 12.25 Меладрама «Жонка майго мужа» (16+).**
**13.10, 15.15 Меладрама «Безабаронная сэрца» (16+).**
17.45 Беларуская часінка.
**19.10 Меладрама «Намалюй мяне шчаслівай» (12+).**
21.00 Панарама.
21.50 Зразумелая палітыка.
**22.05 Серыял «След» (16+).**

### АНТ

6.00, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30 Нашы навіны.
9.10 Контуры.
10.15 «Жыць здарова!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.10 «Белыя Росы» (12+).
**12.40, 13.15, 22.45 Фільм «Сын майго бацькі» (16+).**
15.05 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
19.00 «Яшчэ не вечар» (16+).
20.10 Вячэрнія навіны.
21.20 «Прапаганда» (16+).
**21.40 Фільм «Аддай сваё жыццё» (16+).**
0.35 «Твар у твар» (16+).

### СТБ

6.00, 6.45, 7.45, 8.45 «Раніца СТБ».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00 «Тыдзень».
10.20 «Слова і справа».
10.45 «Чалавек з дому насупраць».
12.20 «Рускія таямніцы» (16+).
13.50, 0.50 «Пазл».
16.50 «Міншчына».
**17.00 «Неўскі. Чужы сярод чужых».**
18.30 «Па сутнасці».
20.15 «Пытанні ад бландзінак».
20.25, 23.05 «СТБ-спорт».
20.35 «Сталічныя падрабязнасці».
20.45 «Хуткая дапамога-5».
23.20 «Азаронак. Напрамую».

### МІР

5.00 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30 Навіны.
6.15 Спецыяльны рэпартаж (12+).
**6.30, 10.20 Тэлесерыял «Мар'ін гай-2» (16+).**
10.10 «Беларускі стандарт» (12+).
12.30 «Зразумець. Прабачыць» (16+).
13.15 «Міравое пагадненне» (16+).
14.10 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15 «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
17.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
18.50 «Мільён за 5 хвілін» (16+).
19.30 «Гульня ў кіно». (16+).
21.45 «Гульня ў кіно. Фільмы Перамогі» (16+).
22.30 «Легенды аб Кругу» (16+).
1.55 Першы Еўразійскі канал (12+).
**3.00 Маст. фільм «Вясна» (16+).**
4.45 Мультфільмы (6+).

### Першы Інфармацыйны

5.00, 6.05 Галоўны эфір (12+).
5.20, 9.35, 12.50, 18.50, 22.50, 0.15 Баявое дзяжурства (12+).
5.30, 6.30 Навіны эканомікі (12+).
5.35, 6.35, 7.45, 8.40, 13.20 Прэс-агляд (12+).
5.40, 6.40 Меркаванне клуба (12+).
5.50, 8.55 Тэхнагайд (12+).
6.00, 0.00 Гімн.
6.50 Громаў LIVE (12+).
7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00 Навіны.
7.35, 18.40, 23.50, 3.45 Аўтарскі погляд (12+).
7.40, 8.35, 8.45, 9.45, 10.50, 11.30, 11.55, 12.30, 13.25, 14.30, 15.30, 16.30, 18.30, 20.00, 20.30, 21.30, 22.00, 23.00, 23.30, 0.05, 0.35, 1.00, 2.00, 3.00, 4.00 Навіны. Дайджэст.
7.50, 9.50 Сусветная навука (12+).
10.10 Вакол планеты (12+).
11.10, 11.35, 21.15 Тэлефільм (16+).
12.35, 14.10, 14.40, 15.35, 16.40, 17.40, 20.40, 23.35, 3.30, 4.30 Спецыяльны рэпартаж (12+).
13.30 Твой горад (12+).
13.45, 15.15, 16.10, 18.10, 22.15, 4.45 Актуальнае інтэрв'ю (12+).
14.00, 17.20 Навіны. Мінск.
14.35, 16.35, 18.35, 1.10, 3.10 Дзень спорту.
19.35, 22.35, 0.20, 1.15, 2.15, 3.15, 4.15 Сфера інтарэсаў (12+).
20.05, 23.15, 0.40 Зразумелая палітыка (12+).
1.30, 2.30 Дак. фільм (12+).

### РТР—Беларусь

6.00, 9.00, 10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
6.05 «Новая раніца».
9.05, 10.05 Фільм «Ні да сяла, ні да горада...» (12+)
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 «Акцэнты».
12.40 «Пра самае галоўнае» (12+).
13.45 «Плюс-мінус».
14.40 «60 Хвілін».
17.40 «Ёсць пытанне з Вадзімам Гігіным».
18.35 Гумарыстычная праграма (16+).
18.45 «Малахаў» (16+).
**21.30, 23.15 Фільм «Каля самага мора» (16+).**
23.40 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

6.05 «Астрапрагноз».
6.10 Беларусы (6+).
6.45 «Навука побач» (6+).
7.25 «Маршрут пабудаваны» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.25 Знак якасці (6+).
**8.45, 10.35 Фільм «Расклад на пазаўтра» (12+).**
11.00 Драма «Прыкаваны» (16+).
13.25, 22.40, 23.40 Сёння. Галоўнае.
13.30 «Надзвычайнае здарэнне».
13.55 «За гранню» (16+).
14.55 «ДНК» (16+).
16.35, 20.00 Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.40 Серыял «Воўчы бераг» (16+).**
21.20 «НЗ.by».
**22.45, 23.55 Баявік «Толькі наперад» (16+).**

### Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня».
8.05, 13.00, 16.25, 20.25, 23.40 «Навіны культуры».
**8.15, 21.05 «Начныя ластаўкі». Маст. фільм (12+).**
10.00 «Культурны тыдзень».
**10.40, 16.35 «Госця з будучыні». Маст. фільм (12+).**
11.45 «Нацыянальны хіт-парад».
12.35 «Жывая спадчына».
13.15, 17.45 «Легенды кіно» (12+).
**13.50, 18.20 «Кадрыля». Маст. фільм (12+).**
15.20 «Наперад у мінулае».
15.55 «Навука побач» (6+).
19.50 Дак. фільм.
20.40 «Калыханка» (0+).
22.45 «Хроніка Мінскага гета». Фільм першы (12+).
23.55 «Блакадная сцэна». Дак. фільм (12+).

### Беларусь 5

6.55, 10.45 Гандбол. СЕХА-Ліга. Фінал 4-х.
08.40 Тэніс.
12.40 Вынікі тыдня.
13.20 Самба. Кубак свету. Мужчыны. Жанчыны.
15.05 Вялікі спорт.
15.50, 23.20 Змешаныя адзінаборствы.
17.55 Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны «Будаўнік» (Брэст) — ХК «Мінск». У перапынку — «Спорт-цэнтр».
19.25 Баскетбол. Адзіная ліга. ЦСКА (Масква) — «Зеніт» (Санкт-Пецярбург). У перапынку — «Спорт-цэнтр».
21.25 На мяжы фолу. Футбольны агляд.
22.50 Арэна.

### Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
0.00, 13.25, 16.55 Тэлебарометр.
**10.05 Дэтэктыў «Арлінская». Фільм «Прыставанні Амура» (16+).**



13.55 Я з вёскі (12+).
14.30 Як дома (16+).
15.00 Смачна есці (12+).
15.40 «Барбоскіны на дачы» (6+).
**17.00 Серыял «Дах свету» (16+).**
18.20 Суд вырашыць (16+).
19.25 «Сляпая».
**20.20 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).**
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.15 Серыял «Галка і Гамаюн» (12+).**
**23.15 Дэтэктыў «Загадка на дваіх. Зніклы пацыент» (16+).**
0.10 «Сям'я. Перазагрузка» (16+).

## Аўторак, 10 чэрвеня

### Беларусь 1

6.00, 7.15, 8.20 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
8.15, 18.45 Зона X (16+).
9.15 «Здарова здаровым быць!» (6+)
**10.10, 22.00 Серыял «След»(16+).**
12.25, 23.55 «Скажынемаўчы».
**13.25, 15.15 Меладрама «Дарэчы, пра матылькоў» (12+).**
17.45 Беларуская часінка.
**19.10 Меладрама «Намалюй мяне шчаслівай» (12+).**
21.00 Панарама.
21.50 Гэта іншае.

### АНТ

6.00, 7.15, 8.15, 9.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30 Нашы навіны.
7.10, 8.10 «Трывожная кнопка» (16+).
10.00 «Прапаганда» (16+).
10.20 «Жыць здарова!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
**12.15, 13.15, 22.30 Фільм «Сын майго бацькі» (16+).**
14.30 «Наша смешнае жыццё» (16+).
15.05 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
19.00 «Няхай гавораць» (16+).
20.10 Вячэрнія навіны.
**21.20 Фільм «Аддай сваё жыццё» (16+).**
0.20 Час.

### СТБ

6.00, 6.45, 7.45, 8.45 «Раніца СТБ».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.00, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00 «Рашэнне ёсць! Дэпутацкі адказ».
9.30 «Па сутнасці».
10.45 «Чалавек з дому насупраць».
12.15 «Назад у СССР» (16+).
13.50, 0.50 «Пазл».
15.40 «Запаведны спецназ».
16.50 «Міншчына».
**17.00 «Неўскі. Чужы сярод чужых».**
19.50 Футбол.
22.00 Дак. праект.
23.05 «СТБ-спорт».
23.20 «Азаронак. Напрамую».

### МІР

5.00, 3.50 Мультфільмы (6+).
6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30 Навіны.
6.15, 0.25, 2.10 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**6.40, 10.10 Тэлесерыял «Мар'ін гай-2» (16+).**
12.30 «Зразумець. Прабачыць» (16+).
13.15 «Міравое пагадненне» (16+).
14.10 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15 «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
17.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
18.50 «Мільён за 5 хвілін» (16+).
19.30 «Гульня ў кіно» (16+).
21.45 «Гульня ў кіно. Фільмы Перамогі» (16+).
**22.30 Маст. фільм «Сцеражыся аўтамабіля» (16+).**
1.15 Першы Еўразійскі канал (12+).

### Першы Інфармацыйны

5.00, 5.30, 6.05, 6.30, 7.40, 8.35, 8.45, 9.45, 10.30, 11.30, 11.55, 12.30, 13.35, 14.30, 17.30, 15.30, 15.30 18.30, 20.00, 20.30, 21.00, 22.00, 23.00, 23.30, 0.05, 1.00, 2.00, 3.00, 4.00 Навіны. Дайджэст.
5.10, 5.40, 6.15 Навіны эканомікі (12+).
5.20, 09.35, 12.50, 18.50, 0.15 Баявое дзяжурства (12+).
5.50, 7.50, 8.40, 9.50 Прэс-агляд (12+).
6.00, 0.00 Гімн.
6.40, 12.35, 14.10, 14.40, 15.35, 16.40, 17.40, 20.40, 23.35, 3.30, 4.30 Спецыяльны рэпартаж (12+).
7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00 Навіны.
7.35, 13.40, 18.40, 23.50 Аўтарскі погляд (12+).
8.55, 13.50 Тэхнагайд (12+).
10.10, 13.20, 15.15, 16.10, 18.10, 20.05, 22.15, 23.15, 0.35 Актуальнае інтэрв'ю (12+).
10.35 Зразумелая палітыка (12+).
11.10, 11.35, 21.15 Тэлефільм (16+).
14.00, 17.20 Навіны. Мінск.
14.35, 16.35, 18.35, 1.10, 3.10 Дзень спорту.
19.35, 22.35, 0.20, 1.15, 2.15, 3.15, 4.15 Сфера інтарэсаў (12+).
22.50, 0.50, 3.45 Навіны-сеткі (12+).
1.30, 2.30 Дак. фільм (12+).

### РТР—Беларусь

6.00, 9.00, 10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
6.05 «Новая раніца».
9.05, 10.05 Фільм «Ні да сяла, ні да горада...» (12+)
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 «САСС упаўнаважаны заявіць».
12.40 Гумарыстычная праграма (16+).
12.50 «Кропкі над і» (16+).
14.40 «60 Хвілін».
**17.40 Фільм «Піраты XX стагоддзя» (12+).**
19.00 «Малахаў» (16+).
**21.30, 23.15 Фільм «Каля самага мора» (16+).**
23.40 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

6.10 «Астрапрагноз».
6.15, 7.05, 13.25, 22.40, 23.40 Сёння. Галоўнае.
6.20 «Здарова здаровым быць!» (6+)
7.20 «Маршрут пабудаваны» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.25 Зразумелая палітыка.
8.40, 21.20 «НЗ.by».
9.00 Гісторыі выратавання (12+).
**9.30, 10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
13.30 «Надзвычайнае здарэнне».
13.55 «За гранню» (16+).
14.55 «ДНК» (16+).
16.35, 20.00 Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.40 Серыял «Воўчы бераг» (16+).**
**22.45, 22.55 Баявік «Тайфун» (16+).**

### Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.25 «Беларуская кухня».
8.05, 12.55, 16.40, 20.25, 23.35 «Навіны культуры».
**8.15, 21.05 «Начныя ластаўкі». Маст. фільм (12+).**
10.00 «Кадры жыцця».
**10.50, 17.20 «Госця з будучыні». Маст. фільм (12+).**
12.00 «Новыя людзі».
13.10, 18.25 «Легенды кіно» (12+).
**13.45 «Вій». Маст. фільм (12+).**
15.05 «Славянскі базар у Віцебску-2024».
16.55 «Жывая спадчына».
**19.05 «Каханая жанчына механіка Гаўрылава». Маст. фільм (12+).**
20.40 «Калыханка» (0+).
**22.45 «Хроніка Мінскага гета». Фільм другі (12+).**

### Беларусь 5

6.55 Баскетбол. Адзіная ліга. ЦСКА (Масква) — «Зеніт» (Санкт-Пецярбург).
8.55 Арэна.
9.25 На мяжы фолу. Футбольны агляд.
10.50 Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. «Будаўнік» (Брэст) — ХК «Мінск».
12.15 Баскетбол 3х3. Палава-арэна.
15.20 Танцавальны спорт. Чэмпіянат Беларусі.
17.25 На спорце.
17.40 Гульні «на вырост».
18.10 Гісторыя адной перамогі.
18.25 Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. «Будаўнік» (Брэст) — ХК «Мінск». У перапынку — «Спорт-цэнтр».
19.55 Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. МФК «Мінск» — ВРЗ (Гомель). У перапынку — «Спорт-цэнтр».
21.55 Спорт-кадр.
22.25 Змешаныя адзінаборствы.

### Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
10.00, 16.55 Тэлебарометр.
**10.05, 21.15 Серыял «Галка і Гамаюн» (12+).**
**12.00, 20.25 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).**
12.45, 18.20 Суд вырашыць (16+).
13.50, 19.25 «Сляпая» (16+).
14.55 «На нажах» (16+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
**17.00 Серыял «Дах свету» (16+).**
21.10 Спортлата 6 з 49, КЕНА.
**23.20 Дэтэктыў «Загадка на дваіх. Зніклы пацыент» (16+).**
0.10 «Сям'я. Перазагрузка» (16+).

## Серада, 11 чэрвеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.15, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**8.15, 18.45** Зона X (16+).
**9.15** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**10.10, 22.40 Серыял «След» (16+).**
**12.25** «Скажынемаўчы».
**13.25, 15.15 Меладрама «Школа жаночага шчасця» (16+).**
**17.45** Беларуская часінка.
**19.10 Меладрама «Цені старой шафы» (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.50** «Генацыд. Апошнія сведкі». Маст.-публіцыстычны фільм (16+).
**22.00** Трэнды (12+).

### АНТ

**6.00, 7.15, 8.15, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**7.10, 8.10** «Трывожная кнопка» (16+).
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.15, 13.15, 22.40 Фільм «Ідэальная ахвяра» (16+).**
**14.30** «Наша смешнае жыццё» (16+).
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**19.00** «Аб'ектыўНА» (16+).
**20.00, 0.30** Час.
**21.20** «Усё зразумела з Марынай Караман» (16+).
**21.30 Фільм «Аддай сваё жыццё» (16+).**

### СТБ

**6.00, 6.45, 7.45, 8.45** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** «Рускія таямніцы» (16+).
**10.45 «Паляванне на крылатага льва». Серыял (12+).**
**12.15** «Дарагія таварышы» (16+).
**13.50, 0.50** «Запаведны спецназ».
**16.50** «Міншчына».
**17.00 «Неўскі. Чужы сярод чужых».**
**20.15** «Таемныя спружыны палітыкі».
**20.30, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.45** «Хуткая дапамога-5».
**23.20** «Азаронак. Напрамую».

### МІР

**5.00, 2.55** Мультфільмы (6+).
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**6.15, 1.40** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**6.40, 10.10 Тэлесерыял «Мар'ін гай-2» (16+).**
**12.30** «Зразумець. Прабачыць» (16+).
**13.15** «Міравое пагадненне» (16+).
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
**17.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**18.50** «Мільён за 5 хвілін» (16+).
**19.30** «Гульня ў кіно. Фільмы Перамогі» (16+).
**20.15 Маст. фільм «Юнацтва Пятра» (16+).**
**23.10 Маст. фільм «У пачатку слаўных спраў» (16+).**

### Першы Інфармацыйны

**5.00, 5.30, 6.05, 6.30, 7.40, 8.35, 8.45, 9.45, 10.30, 11.30, 11.55, 12.30, 13.35, 14.30, 17.30, 15.30, 15.30 18.30, 20.00, 20.30, 21.00, 22.00, 23.00, 23.30, 0.05, 0.35, 1.00, 2.00, 3.00, 4.00** Навіны. Дайджэст.
**5.15, 5.40, 6.15** Навіны эканомікі (12+).
**5.20, 9.35, 12.50, 18.50, 22.50, 0.15** Баявое дзяжурства (12+).
**5.50, 7.50, 8.55, 9.50** Тэхнагайд (12+).
**6.00, 0.00** Гімн.
**6.40, 12.35, 14.10, 14.40, 15.35, 16.40, 17.40, 20.40, 23.35, 3.30, 4.30** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**7.35, 18.40, 23.50, 3.45** Аўтарскі погляд (12+).
**8.40** Прэс-агляд (12+).
**10.10, 13.20, 15.15, 16.10, 18.10, 20.05, 22.15, 23.15, 0.40** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**10.40, 13.40** Навіны-сеткі (12+).
**11.10, 11.35, 21.15** Тэлефільм (16+).
**14.00, 17.20** Навіны. Мінск.
**14.35, 16.35, 18.35, 1.10, 3.10** Дзень спорту.
**19.35, 22.35, 0.20, 1.15, 2.15, 3.15, 4.15** Сфера інтарэсаў (12+).
**1.30, 2.30** Дак. фільм (12+).

### РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05** «Новая раніца».
**9.05, 10.05** Фільм «Ні да сяла, ні да горада... — 2» (12+).
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Рэцэпт сапраўднага беларуса».
**12.25** Гумарыстычная праграма (16+).
**12.50** «Кропкі над і» (16+).
**14.40** «60 Хвілін».
**16.4017.40 Фільм «Мелодыя на два галасы» (12+).**
**20.20** «Так! Але...»
**21.30, 23.15 Фільм «Карнавал» (12+).**
**0.30 Фільм «Госця з мінулага» (12+).**

### НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15, 7.05, 8.25, 13.25, 22.40, 23.40** Сёння. Галоўнае.
**6.20** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.20** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35, 21.20** «НЗ.by».
**8.55** Гісторыі выратавання (12+).
**9.25, 10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**13.30** «Надзвычайнае здарэнне».
**13.55** «За гранню» (16+).
**14.55** «ДНК» (16+).
**16.35, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.40 Серыял «Воўчы бераг» (16+).**
**22.45, 22.55 Баявік «Тайфун» (16+).**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35, 12.25** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.55, 16.45, 20.25, 23.40** «Навіны культуры».
**8.15, 21.05 «Начныя ластаўкі». Маст. фільм (12+).**
**10.00** «Кадры жыцця».
**10.50, 17.20 «Госця з будучыні». Маст. фільм (12+).**
**12.00** «Новыя людзі».
**13.10, 18.30** «Легенды кіно» (12+).
**13.50 «Каханая жанчына механіка Гаўрылава». Маст. фільм (12+).**
**15.05** «Славянскі базар у Віцебску-2023».
**16.55** «Жывая спадчына».
**19.10 «Вій». Маст. фільм (12+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.45** «Хроніка Мінскага гета». Фільм трэці (12+).

### Беларусь 5

**6.55** Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. «Будаўнік» (Брэст) — ХК «Мінск».
**8.25** Спорт-кадр.
**08.55** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. МФК «Мінск» — ВРЗ (Гомель).
**10.55** Гісторыя адной перамогі.
**11.15, 21.55** Змешаныя адзінаборствы.
**13.25** Як гэта было.
**13.55** Танцавальны спорт. Чэмпіянат Беларусі.
**16.05** Між іншым.
**16.25** Фактар сілы.
**16.55** Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны. «Вікторыя» (Смалявічы) — «Тэкстыльшчык» (Баранавічы).
**18.25** Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны. ХК «Мінск» — «Рытм» (Гродна). У перапынку — «Спорт-цэнтр».
**19.55** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Сталіца» (Мінск) — «ВітЭн» (Орша). У перапынку — «Спорт-цэнтр».

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 16.55** Тэлебарометр.
**10.05, 21.15 Серыял «Галка і Гамаюн» (12+).**
**12.00, 20.20 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).**
**12.45, 18.25** Суд вырашыць (16+).
**13.50, 19.25** «Сляпая» (16+).
**14.55** «На нажах» (16+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00 Серыял «Сям'я» (16+).**



**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**23.15 Дэтэктыў «Загадка на дваіх. Зніклы пацыент» (16+).**
**0.05 «Сям'я. Перазагрузка» (16+).**

## Чацвер, 12 чэрвеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.15, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**8.15, 18.45** Зона X (16+).
**9.15** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**10.10, 22.10 Серыял «След» (16+).**
**12.25, 0.00** «Скажынемаўчы».
**13.25, 15.15 Меладрама «Мілая суседка» (16+).**
**17.45** Беларуская часінка.
**19.10 Меладрама «Цені старой шафы» (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.50** На кантролі Прэзідэнта (12+).

### АНТ

**6.00, 7.15, 8.15** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**7.10, 8.10** «Трывожная кнопка» (16+).
**9.10** «Аб'ектыўНА» (16+).
**10.10** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Усё зразумела з Марынай Караман» (16+).
**11.25** «Модны прыгавор» (6+).
**12.25, 13.15, 22.30 Фільм «Ідэальная ахвяра» (16+).**
**14.35** «Наша смешнае жыццё» (16+).
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** Канцэрт «Цячэ рака Волга».
**19.00** «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**20.00, 0.15** Час.
**21.20 Фільм «Аддай сваё жыццё» (16+).**

### СТБ

**6.00, 6.45, 7.45, 08.45** «Раніца СТБ».
**06.30, 07.30, 08.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**09.00** «Рускія таямніцы» (16+).
**10.45 «Паляванне на крылатага льва». Серыял (12+).**
**12.15** «Дарагія таварышы» (16+).
**13.50, 0.50** «Запаведны спецназ».
**16.50** «Міншчына».
**17.00 «Неўскі. Чужы сярод чужых».**
**19.15** «Свае».
**20.15** «Накіпела».
**20.25, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.45** «Хуткая дапамога-5».
**23.20** «Азаронак. Напрамую».

### МІР

**5.00, 7.00, 2.10** Мультфільмы (6+).
**5.35 Маст. фільм «Каменная кветка» (6+).**
**8.30 Маст. фільм «Выпадак у квадраце 36-80» (16+).**
**10.00, 13.00, 18.00** Навіны.
**10.10 Маст. фільм «У зоне асаблівай увагі» (16+).**
**12.15, 13.15 Маст. фільм «Ход у адказ» (16+).**
**14.15, 18.15 Тэлесерыял «Запіскі экспедытара таемнай канцылярыі» (16+).**
**22.00 Маст. фільм Юнацтва Пятра» (16+).**
**0.50** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).

### Першы Інфармацыйны

**5.00, 5.30, 6.05, 6.30, 7.40, 8.35, 8.45, 9.45, 10.30, 11.30, 11.55, 12.30, 13.35, 14.30, 17.30, 15.30, 15.30 18.30, 20.00, 20.30, 21.00, 22.00, 23.00, 23.30, 0.05, 1.00, 2.00, 3.00, 4.00** Навіны. Дайджэст.
**5.10, 5.40, 6.15** Навіны эканомікі (12+).
**5.20, 9.35, 12.50, 18.50, 22.50, 0.15** Баявое дзяжурства (12+).
**5.50, 7.50, 8.40** Прэс-агляд (12+).
**6.00, 0.00** Гімн.
**6.40, 10.40, 12.35, 14.10, 14.40, 15.35, 16.40, 17.40, 20.40, 23.35, 3.30, 4.30** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**7.35, 13.40, 0.50** Аўтарскі погляд (12+).
**8.50, 9.50, 13.50** Тэхнагайд (12+).
**10.10, 13.20, 15.15, 16.10, 18.10, 20.05, 22.15, 23.15, 0.35** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**11.10, 11.35, 21.15** Тэлефільм (16+).
**14.00, 17.20** Навіны. Мінск.
**14.35, 16.35, 18.35, 1.10, 3.10** Дзень спорту.
**18.40, 23.50, 3.45** Вам тэлеграм (12+).
**19.35, 22.35, 0.20, 1.15, 2.15, 3.15, 4.15** Сфера інтарэсаў (12+).
**1.30, 2.30** Дак. фільм (12+).

### РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05** «Новая раніца».
**9.05, 10.05 Фільм «Ні да сяла, ні да горада... — 2» (12+).**
**11.00, 14.00, 17.00** Весткі. Дзень Расіі.
**11.40** «Ствараем разам».
**12.00** Масква. Крэмль. Цырымонія ўручэння Дзяржаўных прэмій Расійскай Федэрацыі.
**13.00** «Кропкі над і» (16+).
**14.40** Вялікі гумарыстычны канцэрт да юбілею Ліёна Ізмайлава (16+).
**17.40** Гумарыстычная праграма (12+).
**17.55** «Песні ад усёй душы» (12+).
**20.00** Весткі.
**21.30, 23.15** Вялікі святочны канцэрт, прысвечаны Дню Расіі. Трансляцыя з Краснай плошчы.
**23.50 Фільм «Экіпаж» (12+).**

### НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15, 7.05, 8.15, 13.00, 22.40, 23.40** Сёння. Галоўнае.
**6.20** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.20** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.30, 21.55** «НЗ.by».
**8.50** Сямейная справа (6+).
**9.10, 10.20 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**13.05, 16.30, 19.35, 20.15, 22.15, 22.45, 23.55 Дэтэктыў «Дэльфін» (16+).**
**16.20, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35, 12.25** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.55, 16.45, 20.25, 23.35** «Навіны культуры».
**8.15, 21.05 «Начныя ластаўкі». Маст. фільм (12+).**



**10.00** «Кадры жыцця».
**10.50, 17.20 «Госця з будучыні». Маст. фільм (12+).**
**12.00** «Новыя людзі».
**13.10** «Легенды кіно» (12+).
**13.45 «Тры тапалі на Плюшчысе». Маст. фільм (12+).**
**15.05** «Славянскі базар у Віцебску-2023».
**16.55** «Жывая спадчына».
**18.30** «Апошні дзень». (12+).
**19.05 «Развітальная гастроль «Артыста». Маст. фільм (12+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.45** «Хроніка Мінскага гета». Фільм чацвёрты (12+).

### Беларусь 5

**6.55** Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны. ХК «Мінск» — «Рытм».
**8.25** Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны. «Вікторыя» (Смалявічы) — «Тэкстыльшчык».
**9.50** Між іншым.
**10.10** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Сталіца» (Мінск) — «ВітЭн» (Орша).
**12.10** Змешаныя адзінаборствы.
**14.15** Як гэта было.
**14.45** Тэніс.
**16.55** Баскетбол. Адзіная ліга. «Зеніт» (Санкт-Пецярбург) — ЦСКА (Масква). У перапынку — «Спорт-цэнтр».
**18.55** Фактар сілы.
**19.25** Спорт-цэнтр.
**19.35** Агляд НХЛ.
**20.20** Арэна.
**20.50** Урачыстая цырымонія закрыцця сезона 2024 г. / 2025 г. ХК «Дынама-Джуніверс».
**22.25** Бокс.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 16.55** Тэлебарометр.
**10.05, 21.15 Серыял «Галка і Гамаюн» (12+).**



**11.55, 20.25 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).**
**12.45, 18.20** Суд вырашыць (16+).
**13.50, 19.25** «Сляпая» (16+).
**14.55** «На нажах» (16+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00 Серыял «Сям'я» (16+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**23.20 Дэтэктыў «Загадка на дваіх. Зніклы пацыент» (16+).**
**0.10** «Сям'я. Перазагрузка» (16+).

## Пятніца, 13 чэрвеня

### Беларусь 1

